

За змену брыгада «хуткай» можа выехаць на два дзясяткі выклікаў. Аднак толькі недзе 5% з іх адносяцца да экстранных, калі жыццё знаходзіцца пад пагрозай. А бывае і наадварот — небяспека пагражае лекару... СТАР 3



У Гомелі прыватная фірма па вырабе корпуснай мэблі прадастаўляе зніжку тым кліентам, якія размаўляюць па-беларуску. Справа ідзе не хутка, але з добрай усмешкай, з цудоўным настроем. СТАР 4



Ажыятажны попыт на здымнае прыватнае жыллё ў сталіцы летась выклікаў істотнае падаражанне арэнды. Сёлета чаканая тэндэнцыя на патанненне здымных кватэр у міжсезонні ў Мінску не спрацавала. СТАР 5

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 мая 2013 г. ЧАЦВЕР № 92 (27457) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# СПАДЧЫНА АБ'ЯДНОЎВАЕ

## У МІНСКУ РАСПАЧАЎСЯ VIII БЕЛАРУСКІ МІЖНАРОДНЫ МЕДЫЯФОРУМ

**Адкрыццё форуму, які сёлета будзе працаваць да 25 мая пад назвай «Партнёрства ў імя будучыні: гісторыка-культурная спадчына як фактар яднання», прайшло ўчора ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Удзел у медыяфоруме бяруць гэтым разам 15 дзяржаў, перад якімі стаіць задача распрацаваць адзіную стратэгію па падтрымцы культурнай і гістарычнай спадчыны ўсіх краін, наладзіць канструктыўны дыялог культур і сфарміраваць адзіную гуманітарную прастору.**



Фотаздымкі Любові БЕЛЯЕВАЙ





Тэмай форуму нездарма стала гісторыка-культурная спадчына. Менавіта культура з'яўляецца самым магутным механізмам усталявання паразумення паміж рознымі народамі. І толькі прызнаўшы каштоўнасць і ўнікальнасць кожнай культуры, традыцый кожнага народа, можна дабіцца росквіту культуры ўласнай і наладзіць сапраўды культурны дыялог. Выдатна, што арганізатары медыяфоруму — Міністэрства інфармацыі Беларусі, Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы, Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД, Беларускі саюз журналістаў — і замежныя ўдзельнікі разумеюць значнасць падтрымкі нацыянальных культур і недапушчальнасць уніфікацыі ў гэтай галіне. Гэтай высакароднай місіі стараюцца служыць і СМІ, не ў апошнюю чаргу для падтрымкі і развіцця якіх штогод ладзіцца форум.

— За час правядзення Беларускі медыяфорум стаў знакавай дыялогавай пляцоўкай, ён дазваляе не толькі эфектыўна абмяркоўваць актуальныя праблемы журналісцкай супольнасці краін СНД, але і выбудоўваць доўгатэрміновае плённае супрацоўніцтва ў медыйнай сферы на карысць нашых дзяржаў і народаў, — адзначыў **Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ, міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь.** — Мы дзелімся вопытам, канцэптуальнымі задумамі, ідэямі, кансалідуем сілы для вырашэння агульных праблем, тым самым фарміруючы адзіную інфармацыйную і гуманітарную прастору. У гэтай прасторы вечнымі каштоўнасцямі журналісцкай працы застаюцца адказнасць, увага да чалавека, вернасць грамадзянскаму доўгу. Мы ўсе разам выхоўваем сумленных і адказных журналістаў. І сёння, у эпоху імклівага развіцця інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій, захаванне духоўнага падмурка з'яўляецца найважнейшым сацыяльным фактарам для паспяховага развіцця любога грамадства. Летапіс беларускай гістарычнай прасторы ў цэлым мае і светлыя, і трагічныя старонкі. Гістарычную праўду, светлую памяць пра подзвіг нашых бацькоў і дзядоў мы павінны не толькі беражліва насіць у сэрцах, але ўмець захоўваць у новых інфармацыйна-тэхналагічных умовах.

У чатырохдзённага мерапрыемства вельмі шчыльны расклад. Учора для гасцей Мінска дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі правёў адмысловую экскурсію па бібліятэцы пад назвай «Кніжная спадчына Беларусі». Асобна вылучаецца тэма важнасці захавання гістарычнай праўды пра Вялікую Перамогу ў рамках эксперт-сесіі «Беларусь — старонкі мужнасці» ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага.

Сёння адбудзецца пленарнае пасяджэнне медыяфоруму ў Мірскім замку. У сценах помніка сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА адбудуцца абмеркаванні па наступных тэмах: «Дыялог культур — дыялог народаў», «Сродкі масавай інфармацыі: гістарычная місія ў захаванні і развіцці гісторыка-культурнай спадчыны», «Мова, нацыянальная літаратура як фактары суверэнітэту дзяржаў і яднання народаў». Гасцям прадэманструюць каларыт і традыцыі беларускай культуры падчас тэатралізаванай пастаноўкі «У славу МІРа».

Асобная ўвага будзе нададзена навучанню і павышэнню кваліфікацыі журналістаў. У фармаце прэс-клуба і «Культурнага марафону» пройдзе летняя школа журналістыкі на базе Інстытута журналістыкі БДУ. Удзельнікі форуму нарэшце абмяркуюць актуальныя для беларускай арт-журналістыкі тэмы: павышэнне прафесіянальнага ўзроўню журналістаў, якія пішуць пра культуру, і павышэнне прэстыжу «культурнай журналістыкі» наогул, а таксама прыцягненне ўвагі грамадскасці да праблем і дасягненняў культуры праз СМІ.

Асобна варта адзначыць, што ў рамках медыяфоруму ўпершыню ў Мінску пройдзе юбілейны Х Міжнародны конкурс «Мастацтва кнігі» дзяржаў — удзельніц СНД.

**Зоя СВЕТЛАЯ.**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ.**

*— Што можа школа? Даць якасную адукацыю, дапамагчы дзіцяці сацыялізавацца ў грамадстве, прадаставіць яму магчымасць удзелу ў алімпіядах, спаборніцтвах, інтэлектуальных і творчых конкурсах, турнірах, фестывалях, выставах, спартыўных спаборніцтвах і канферэнцыях. Пры гэтым усе цудоўна разумеюць, што асноўны ўплыў на душу і характар дзіцяці, яго самарэалізацыю аказвае менавіта сям'я. Таму без самага непасрэднага і зацікаўленага ўдзелу сям'і ў выхаванні сістэма адукацыі «прайграе» дзяцей і інтэрнэту, і вуліцы, і шкодным звычкам.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.05.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8690,00 | ▲ |
| Еўра | 11230,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 278,50 | ■ |
| Укр. грыўня | 1066,78 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 17 |
| Віцебск | + 16° |
| Гомель | + 18° |
| Гродна | + 16° |
| Магілёў | + 16° |
| Мінск | + 15° |

### «ПРАМАЯ ЛІНІЯ» МУС

## КАБ АДЧУВАЦЬ СЯБЕ Ў БЯСПЕЦЫ

У Міністэрстве ўнутраных спраў адбудзецца «прамая лінія» з **намеснікам міністра ўнутраных спраў — начальнікам міліцыі грамадскай бяспекі МУС Рэспублікі Беларусь Мікалаем Аляксандравічам МЕЛЬЧАНКАМ.**

Пытанні пра асабістую і маёмасную бяспеку, своечасовае рэагаванне на паведамленні аб правапарушэннях, ахову грамадскага парадку, прафілактыку злачынстваў, бяспеку дарожнага руху, аказанне ахоўных паслуг можна задаць **сёння, 23 мая, з 15.00 да 16.00 па нумары: (017) 218 55 30.**

■ Увага: «прамая лінія»!

## НАШ КУЛЬТУРНЫ СВЕТ

З чаго ён складаецца, як захоўваецца і ўзбагачаецца? На ўсе пытанні, якія тычацца існавання і развіцця культуры ў Рэспубліцы Беларусь, можна атрымаць адказ з вуснаў **міністра культуры Барыса Уладзіміравіча СВЯТЛОВА**. «Прамая лінія» пройдзе ў рэдакцыі газеты «Звязда» **сёння ў 11 гадзін**. Тэлефоны, па якіх можна звяртацца з пытаннямі ў гэты дзень: 287-18-66, 287-18-71.

Папярэдне пытанні прымаюцца па тэлефоне ў Мінску 287-18-69, таксама іх можна дасылаць поштай ці на электронны адрас: info@zviazda.minsk.by (з паметкай «для аддзела культуры»). Адказы на найбольш цікавыя і актуальныя пытанні будуць надрукаваны ў газеце.

# НАЛЕТА Ў МІНСКУ БУДЗЕ ПАБУДАВАНА ШЭСЦЬ АРЭНДНЫХ ДАМОЎ

**Пра гэта ўчора паведаміў намеснік старшыні камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Аляксандр СЦЯПАНАЎ.**

Спецыяліст адзначыў, што сёлета ўжо ўведзены ў эксплуатацыю два арэндныя дамы на тэрыторыі Парка высокіх тэхналогій для супрацоўніка гэтага парка. На чарзе яшчэ адзін дом, а ўвогуле сёлета ў Мінску плануецца пабудаваць каля 35 тысяч квадратных метраў здымнага жылля. У 2014 годзе горадам запланавана ўзвядзенне шасці арэндных дамоў, мінімум адзін з якіх — у жыллёвым квартале «Магістр» для навукоўцаў, выкладчыкаў і работнікаў культуры. Астатнія дамы будуць пабудаваны «кропкавым» метадам у розных мікрараёнах сталіцы.

Сфера арэнднага жылля сёлета актыўна развіваецца на тэрыторыі ўсёй краіны, лічыць начальнік юрыдычнай працы і кадраў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Наталля Кухарчык. Па стане на 1 красавіка ў краіне налічваецца 1132 жылыя памяшканні камерцыйнага карыстання, з якіх у Мінску 281 кватэра. Прыбытак ад здачы такога жылля ў арэнду склаў толькі за першы квартал года больш як 914 мільёнаў рублёў. Сёлета арэнднае жыллё будуецца ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. На гэты год плануецца пабудаваць у Брэсцкай вобласці 272 жылыя памяшканні такога тыпу, у Віцебскай — 120, у Гомельскай — 250, у Гродзенскай — 198, у Магілёўскай — 267 і ў Мінскай — 462 кватэры камерцыйнага карыстання.

Галоўным чынам арэнднае дзяржаўнае жыллё ўяўляе сабой невялікія аднапакаёвыя ці двухпакаёвыя кватэры ў шматпавярховых панэльных дамах. Арэндная стаўка такога жылля складае 20 тысяч рублёў за квадратны метр (базавая стаўка), яна карэктуецца адпаведнымі каэфіцыентамі, што вызначаюцца аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам. Самы вялікі такі каэфіцыент (1,5) дзейнічае ў цэнтральных раёнах Мінска.

Адказваючы на пытанне пра магчымае змяненне статусу непрыватызаваных кватэр, спадарыня Кухарчык удакладніла, што зараз дзяржаўны жылфонд складае каля 390 тысяч жылых памяшканняў. СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КАМІТЭТ СЕНАТА ЗША ЎХВАЛІЎ ПАСТАЎКІ ЗБРОІ СІРЫЙСКАЙ АПАЗІЦЫІ



Камітэт сената ЗША па замежных справах большасцю галасоў ухваліў законапраект, які санкцыянуе пастаўкі зброі для сірыйскай апазіцыі. Пры гэтым не выключаюцца пастаўкі паўстанцам абарончых зенітных комплексаў, якія, па словах аўтараў дакумента, будуць ажыццяўляцца са «строгімі абмежаваннямі і патрабуюць асобных прэзідэнцкіх распараджэнняў». Пры гэтым у дакуменце падкрэсліваецца, што пастаўкі будуць тычыцца толькі тых паўстанцкіх груповак, якія адпавядаюць «пэўным крытэрыям у сферы правоў чалавека і барацьбы з тэрарызмам». Разам з тым члены камітэта не выключаюць, што гэтая зброя можа трапіць «у не тыя рукі», гэта значыць, той часткі баевікоў, якая звязана з «Аль-Каідай».

### НЯМЕЦКАЯ IT-КАМПАНІЯ ПРЫМЕ НА ПРАЦУ СОТНІ ТАЛЕНАВІТЫХ АЎТЫСТАЎ

Нямецкая IT-кампанія SAP AG мае намер прыняць на працу сотні людзей з аўтызмам, паколькі сярод іх, на думку кампаніі, шмат таленавітых праграмістаў, перадаюць інфармагенцтвы.

Аўтыстаў плануецца задзейнічаць для распрацоўкі і тэсціравання камп'ютарных праграм, а таксама для забеспячэння кантролю за якасцю прадукцыі, што выпускаецца. Член савета дырэктараў кампаніі Луіза Дэльгада паведаміла, што да 2020 года SAP AG прыме на працу 650 людзей з аўтызмам. Паводле яе слоў, менавіта дзякуючы людзям, якія думаюць інакш, адбываецца развіццё інавацый. Як заяўляюць у SAP, яны ўжо нанялі шэсць чалавек, якім быў дыягнаставаны аўтызм, на пасады тэсціроўшчыкаў праграмнага забеспячэння ў Індыі, пасля чаго эфектыўнасць гэтага офіса павысілася. Цяпер кампанія мае намер наняць такіх супрацоўнікаў у прадстаўніцтва SAP па ўсім свеце.

### У ЛАТВІІ ІЗАЛЮЮЦЬ АГРЭСІЎНЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

Урад Латвіі прыняў рашэнне ізаляваць агрэсіўна настроеных школьнікаў ад астатніх дзяцей.

Зацверджаны змены ў правілы забеспячэння бяспекі вучняў у школах. Згодна з новымі правіламі, у сітуацыях, калі агрэсіўныя дзеці пагражаюць бяспецы іншых навучэнцаў, школы павінны будуць забяспечыць іх навучанне ў асобных памяшканнях. Пра агрэсіўных навучэнцаў педагогі павінны будуць інфармаваць дырэктараў школ. У сваю чаргу дырэктар будзе абавязаны паведаміць пра паводзіны вучня яго бацькам. Калі ў школе няма сацыяльнага педагога або псіхолага, мясцовае самакіраванне павінна будзе даць спецыяліста для працы з такога роду навучэнцамі. Па звестках міністэрства адукацыі Латвіі, у школах краіны расце колькасць агрэсіўных дзяцей, якія ўяўляюць небяспеку не толькі для аднагодкаў, але і для педагогаў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ГАРБАТА З РАМОНКАМ МАЕ СУПРАЦЬРАКАВЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ?

У рамонкавай гарбаце навукоўцы з Універсітэта Агаё знайшлі апігенін — злучэнне, якое можа аслабляць ракавыя клеткі. Клеткі раку грудзей жывуць даўжэй за звычайныя клеткі і лягчэй распаўсюджваюцца. Але апігенін вырашае гэтыя праблемы, адначасова робячы рак адчувальным да хіміятэрапіі, піша The Daily Mail. Акрамя гарбаты з рамонкам, злучэнне можна знайсці ў пятрушцы і сельдэрэі, а таксама ў многіх відах садавіны і гародніны. Дарэчы, апігенін валодае і супрацьзапаленчымі ўласцівасцямі. Ён таксама дапамагае спецыяльным бялкам карэктаваць анамаліі ў РНК, якія стаяць за 80% выпадкаў раку.



Даследаванне паказала: апігенін звязваецца прыкладна са 160 бялкамі ў целе чалавека. Магчыма, аналагічным чынам дзейнічаюць і іншыя супрацьракавыя злучэнні з прадуктаў харчавання. Большасць жа лекаў уздзейнічаюць толькі на адну малекулу.

КОРАТКА

Выстаўка-форум «Мацярынства і дзяцінства» пройдзе 30 мая — 2 чэрвеня ў Мінскім палацы дзяцей і моладзі і азнаёміць спажыўца з разнастайнасцю тавараў і паслуг для маці і дзяцей.

Праезд у грамадскім транспарце Мінска падаражэе з 25 мая да Br2 тыс. Пры куплі талончыка ў вадзіцеля адна паездка абыдзецца ў Br2,5 тыс. Праезд у экспрэс-маршрутах будзе каштаваць пасажыру Br3 тыс.

Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь 29 чэрвеня ўпершыню пакажа спектакль «Лебядзінае возера» Пятра Чайкоўскага каля сцен старадаўняга Тракайскага замка на водах возера Гальвэ.

Еўрапейскі саюз выдзеліў Беларусі 1,4 млн еўра на мерапрыемствы па захаванні ў рэспубліцы папуляцыі вяртлявай чарацянкі. Сродкі плануецца накіраваць на аднаўленне дзвюх мясцін, якія насяляе балотная чарацянка — нізінных балот «Званец» і «Спораўскае» (Брэсцкая вобласць).

Лепшая лёгкаатлетка 2012 года Беларусі Аліна Талай стала бронзавым прызёрам па бегу на дыстанцыі 100 м з бар'ерамі чарговага турніру Сусветнага выкліку, які прайшоў у Пекіне (Кітай).



*Калектыву Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь*

Дарагія сябры!

Сардэчна віншую вас з 80-годдзем з дня заснавання Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

Ваш тэатр — наш гонар і сапраўдны нацыянальны набытак. Яго гісторыя напоўнена яркімі адкрыццямі, незабыўнымі спектаклямі і нязгасным творчым гарэннем выдатных майстроў, якія прынеслі беларускаму мастацтву сусветную славу.

Сёння, як і дзесяцігоддзі назад, Вялікі тэатр захоўвае вернасць высокім эстэтычным ідэалам акадэмічнага мастацтва і ў той жа час застаецца на дзіва сучасным, адкрытым для смелых эксперыментаў і наватарскіх мастацкіх рашэнняў. Цудоўная плеяда праслаўленых артыстаў і маладых талентаў паспяхова вырашае самыя складаныя творчыя задачы.

Упэўнены, што калектыў вашага тэатра і надалей будзе плённа служыць беларускай культуры, узбагачаючы яе скарбніцу бліскучымі прэм'ерамі і запальваючы новыя зоркі.

У гэты святочны дзень зычу вам, дарагія сябры, моцнага здароўя, невычэрпнага натхнення, поспехаў, шчасця і дабра.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

Беларускі экспарцёр:

# «ЯПОНЦЫ ПРОСТА ВЫЦІСНУЛІ З НАС ЯКАСЦЬ...»

**Учора прайшло ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу «Лепшы экспарцёр 2012 года», які праводзіла Беларуская гандлёва-прамысловая палата разам з рознымі дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі і грамадскімі аб'яднаннямі. Вызначана 17 пераможцаў.**

## РОСТ ЭКСПАРТУ АМАЛЬ У ДВА РАЗЫ

Для Беларусі экспарт мае вялікае значэнне, а апошнія дасягненні ў гэтай галіне звяртаюць на сябе ўвагу. «Апошнія гады наш экспарт паказвае станоўчую дынаміку, — расказвае **Дзмітрый Куптэль, намеснік дырэктара дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства замежных спраў Беларусі.** — За 2 гады нарасцілі экспарт у 1,8 раза. Прычым як па экспарце тавараў, так і паслуг. У 2012-м упершыню за апошнія некалькі гадоў мы атрымалі рэкорднае дадатнае знешнегандлёвае сальда — 2,9 млрд долараў. Па выніках першага квартала 2013 года тэмпы больш сціплыя, але мы ўтрымліваем сальда дадатным (каля 400 млн долараў)». Дарэчы, найбольш актыўныя ў экспарце — нафтахімічныя і машынабудаўнічыя прадпрыемствы, але добрую дынаміку паказваюць і сельская гаспадарка з харчовай прамысловасцю. «Дзяржаўныя прадпрыемствы займаюць у экспарце больш за 60%, але прыватныя прадпрыемствы больш мабільныя і перспектыўныя з пункту гледжання яго нарошчвання», — падкрэсліў прадстаўнік міністэрства.

## ПАШЫРЭННЕ НЕАБХОДНА

Міхаіл Мятлікаў, старшыня Беларускай ГПП, адзначыў, што «75% беларускага экспарту сканцэнтраваны ў пяці краінах, хоць Беларусь гандлюе больш чым са 175 краінамі. Эканамічная сітуацыя ў гэтых пяці краінах вельмі сур'ёзна ўплывае на наш экспарт. Таму трэба пашыраць кола партнёраў».

Пра значнасць павелічэння колькасці краін — імпарцёраў нашай прадукцыі кажуць і самі вытворцы. Напрыклад, дырэктар пераможцы конкурсу навукова-вытворчага ўнітарнага прадпрыемства АТОМТЕХ — Валерый Кажамякін сцвярджае, што ўся прадукцыя ў іх навукаёмістая і наватарская. «І ты павінен заўсёды сачыць за тым, каб цябе не выкінулі з рынку», — дзеліцца вопытам кіраўнік. Летась у прадпрыемства былі вялікія пастаўкі ў Японію з-за аварыі на атамнай станцыі «Фукусіма-1». «Трэба было за 6 месяцаў зрабіць вельмі сур'ёзную перапрацоўку прадукцыі пад японскага спажыўца, пад той ізатопны састаў, які склаўся пасля аварыі на Фукусіме. Яны з нас выціснулі самую высокую якасць!», — сказаў Валерый Кажамякін. Добры прыклад «гнуткасці» і мабільнасці для кожнага, хто збіраецца выходзіць на замежныя рынкі.

Такім жа выдатным прыкладам можна лічыць дзейнасць Лідскага малочна-кансервавага камбіната, які таксама стаў пераможцам. Андрэй Эйсымант, генеральны дырэктар прадпрыемства, адзначыў, што «асноўны спажывец прадукцыі — Расія». А там вялікая канкурэнцыя, «свае» расійскія вытворцы малочнай прадукцыі, якія не хочуць пускаць на свой рынак больш якасны беларускі тавар. Але гэта не спужала камбінат. У выніку — яны пераможцы конкурсу.

ООО

Праз адборачны тур конкурсу прайшлі 102 прадпрыемствы, найлепшыя ў адпаведных галінах і рэгіёнах. Ацэньваліся агульны аб'ём экспарту, тэмп яго росту ў 2012 годзе, сальда знешнегандлёвай дзейнасці і аб'ём экспарту на аднаго работніка. У фінале рэспубліканская конкурсная камісія вызначыла пераможцаў у 17 намінацыях. Шэраг прадпрыемстваў узнагародзілі дыпломамі за выдатныя поспехі ў экспарце сваёй прадукцыі.

Конкурс «Лепшы экспарцёр года» праводзіцца ўжо 15 гадоў. Раней прымаць у ім удзел маглі толькі члены гандлёва-прамысловай палаты. З 2007 года фармат быў зменены, і конкурс стаў агульнарэспубліканскім.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# НАЛЕТА Ў МІНСКУ БУДЗЕ ПАБУДАВАНА ШЭСЦЬ АРЭНДНЫХ ДАМОЎ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Гэта не толькі непрыватызаванае жыллё, але і службовыя, спецыяльныя, спецыяльныя службовыя, сацыяльныя жылыя памяшканні, жыллё ў інтэрнатах і дзяржаўныя памяшканні камерцыйнага карыстання.

Згодна з мяркуемымі новаўвядзеннямі, непрыватызаваныя кватэры могуць трапіць у ранг дзяржаўнага жылля камерцыйнага карыстання. Разам з тым стаўка платы за карыстанне такім жыллём будзе ў разы меншая, чым за арэндныя кватэры, якія людзі атрымліваюць зараз.

Паводле інфармацыі Наталлі Кухарчык, сёння ў Беларусі няма чаргі на атрыманне камерцыйнага жылля. Механізм размеркавання арэнднага жылля мае наступны алгарытм. Мясцовы выканкам на сваім сайце паведамляе пра наяўнасць такога жылога памяшкання, пра тое, што гэта за кватэра і колькі яна будзе каштаваць. Потым грамадзяне падаюць адпаведныя заявы. Перавага пры выбары новага кватаранта аддаецца тым чаргавікам, хто раней за іншых быў пастаўлены на жыллёвы ўлік.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Падрабязнасці

## КЛІЕНТ ВЯРНУЎ ГРОШЫ БАНКУ

**Гісторыя з памылкай касіра банка, якая выдала кліенту значна большую суму грошай, чым належала, мела такі ж самы працяг, як і ў мінулы раз: увечары дня, калі пра здарэнне стала вядома, 30-гадовы мінчанін вярнуў тое, што яму не належыць.**

Нагадаем коратка, што ў Цэнтральнае РУУС г. Мінска звярнулася касір філіяла банка, размешчанага на рынку ў Ждановічах: пры абмене кліентам 2,3 тысячы долараў на беларускія рублі яна выдала яму грашовыя сродкі, роўныя ў эквіваленце 23 тысячам долараў. Мужчына забраў грошы і знік.

Вярнуўшы сродкі, кліент расказаў міліцыянерам, што, па-першае, сам сябе пазнаў на распаўсюджаным відэа з камер відэаназірання з філіяла банка, па-другое, яму патэлефанавала шмат знаёмых. Пасля гэтага ён вырашыў звязацца са службай бяспекі банка і вярнуць грошы. Ці трэба казаць, што найбольш такому ходу падзей узрадавалася касір банка, якая звярнулася ў міліцыю з сустрэчнай заявай, маўляў, прашу інцыдэнт лічыць вычарпаным. Дарэчы, аналагічным чынам мінулы раз паступіла і іншы касір, для якой гісторыя з памылковай выдачай значна большай сумы грошай, чым трэба было, скончылася так жа шчасліва.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

## «РАК — ГЭТА ДЫЯГНАЗ, А НЕ ПРЫСУД»

Тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Мінска 23 мая запрашаюць анкапацыентаў і іх блізкіх на Дзень адчыненых дзвярэй «Рак — гэта дыягназ, а не прысуд» з удзелам анколага Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера і групы ўзаемадапамогі і псіхалагічнай падтрымкі анкапацыентаў.

Сустрэча адбудзецца: 23 мая з 18.00 да 20.00 у Тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна (вул. Напалеона Орды, 47а)

Даведкі па тэлефонах: ТЦСАН Маскоўскага раёна — 372-25-33; група падтрымкі — 8-029-6278035, 8-029-7521588.

У Мінску, Бабруйску, Клічаве грамадскае аб'яднанне «Беларуская арганізацыя працоўных жанчын» сумесна з анкапацыентамі таксама плануюць правесці шэраг сустрэч, майстар-класы і «круглы стол».

**Святлана БУСЬКО.**

■ Транспартны вектар

# «ПАСКОРЫЛІСЯ» Ў ЗАХОДНІМ КІРУНКУ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**З 26 мая Беларуская чыгунка пераходзіць на новы графік руху цягнікоў.**

Карэктывы найперш закрануць некаторыя міжнародныя маршруты. Так, летась ад Мінска да Вільнюса можна было дабрацца за 3 гадзіны, а сёлета дзве пары цягнікоў гэтага маршруту (адна беларускага, а другая — літоўскага фарміравання) будуць затрачваць на дарогу 2,5 гадзіны. Час шляху скараціўся за кошт пэўных змен у рэжыме працы мытнага і памежнага кантролю. Беларускі бок будзе весці праверку яшчэ падчас руху цягніка, на ўчастку ад Маладзечна да Гудагая, а літоўскі — на чыгуначным вакзале Вільнюса, у спецыяльна абсталяванай зале.

Варта звярнуць увагу, што ў паскораным рэжыме ад Мінска да Вільнюса і наадварот будуць рухацца толькі дзве пары цягнікоў, а ўсе астатнія саставы гэтага маршрута пакуль што застаюцца з ранейшымі часавымі затратамі на дарогу.

Што датычыць змен на іншых міжнародных маршрутах, то цягнік Мінск — Іркуцк з увядзеннем новага графіка будзе курсіраваць толькі да Новасібірска. Гэта звязана з малой колькасцю пасажыраў на ўчастку Новасібірск — Іркуцк. Таксама плануецца скараціць маршрут цягніка Брэст — Валгаград: цяпер канцавым пунктам стане Саратаў.

Некаторыя міжнародныя саставы атрымалі новыя станцыі адпраўлення. Напрыклад, цягнікі №140/139 Мінск — Сімферопаль і №384/383 Мінск — Марыуполь цяпер будуць адпраўляцца з Баранавіч і курсіраваць праз сталіцу. Састаў №4/3 Мінск — Масква адправіцца з Брэста, №486/485 Мінск — Феадосія — з Гродна, №494/493 Мінск — Сімферопаль — з Полацка, а цягнік №371/372 Мінск — Чарнаўцы паедзе з Магілёва.

— Традыцыйна новы графік на Беларускай чыгунцы ўводзіцца штогод у апошнюю нядзелю мая. Расклад руху на 2013—2014 год прадугледжвае захаванне ўсіх актуальных міжнародных маршрутаў, якія існавалі летась, — адзначыў намеснік начальніка аддзела арганізацыі пасажырскіх перавозак пасажырскай службы Беларускай чыгункі Канстанцін Баяр.

Па яго словах, па-ранейшаму цягнікі будуць хадзіць у Феадосію, Сімферопаль, Еўпаторыю, у сталіцы суседніх дзяржаў і ў далёкае замежжа. Усяго новы графік прадугледжвае 53 пары міжнародных цягнікоў і 32 пары цягнікоў міжрэгіянальных маршрутаў.

Сярод новаўвядзенняў у руху пасажырскіх саставаў, якія курсіруюць па Беларусі, — павелічэнне колькасці цягнікоў на маршруце Мінск — Гродна. Цяпер па ім плануюць пусціць чатыры саставы. Акрамя таго, «паскарэнне» ў заходнім кірунку запланавана не толькі па дарозе ў Вільнюс. Цяпер пасажыры маршруту Мінск — Гродна таксама менш часу затрацяць на дарогу. Калі цягнік у мінулым годзе ехаў 5 гадзін 46 хвілін, то цяпер давядзецца быць у дарозе на 40 хвілін менш. З уводзеннем новага графіка больш хутка атрымаецца даехаць і ў Брэст. Па гэтым маршруце будзе курсіраваць цягнік, якому на дарогу да абласнога цэнтра спатрэбіцца 3 гадзіны 40 хвілін, пры тым што раней гэтая ж адлегласць пераадольвалася за 4 гадзіны 20 хвілін.

Летась паслугамі чыгуначнага транспарту ў Беларусі скарысталася больш за 100 мільёнаў чалавек. Пры гэтым прадстаўнікі Беларускай чыгункі адзначаюць, што за аналагічны перыяд на пасажырскіх перавозках магістраль панесла страты ў памеры 2,1 трыльёна рублёў.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

*У бліжэйшых нумарах «Звязды» будзе надрукаваны новы графік руху цягнікоў рэгіянальных ліній эканом-класа і цягнікоў гарадскіх ліній на 2013 год*

■

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ ПАДМУРАК АГУЛЬНАЙ БУДУЧЫНІ



**22 мая сустрэчай удзельнікаў з міністрам інфармацыі, намеснікам міністра замежных спраў і старшынёй Мінгарвыканкама ў сталіцы Беларусі адкрыўся VIII Беларускі міжнародны медыяфорум. У 2013 годзе тэма гэтага, ужо традыцыйнага для нашай краіны, мерапрыемства гучыць так: «Партнёрства ў імя будучыні: гісторыка-культурная спадчына як фактар яднання».**

За мінулыя гады медыяфорум, які з'яўляецца вынікам супрацоўніцтва беларускай дзяржавы, Выканаўчага камітэта СНД і Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы, стаў знакавай падзеяй. Кожны год ён адзначаўся ўдзелам высокіх службовых асоб, статусных экспертаў і заслужаных прафесіяналаў у сферы медыя. Таму тая тэматыка, якой прысвечана гэтае мерапрыемства, як правіла, з'яўляецца сімвалічнай для постсавецкай прасторы. І хоць у 2013 годзе акцэнты ў форуме зрушаныя з глабальных палітычных пытанняў да даволі вузкай прафесійнай праблематыкі захавання гісторыка-культурнай спадчыны, актуальнасць яго тэмы зноў аказалася высокай.

З 2011 года, калі споўнілася 20 гадоў з часу разбурэння СССР, сацыёлагі і палітолагі краін нашага рэгіёна сталі актыўна абмяркоўваць зусім новы, нязведаны феномен: з'явілася новае пакаленне дзеяздольных і паўнапраўных людзей, якія не жылі і не вучыліся ў Савецкім Саюзе. Хоць гэта новае пакаленне і было выхавана ў рамках інстытутаў, створаных яшчэ ў савецкім грамадскім укладзе, усё ж адсутнасць досведу «таго» жыцця, на думку экспертаў, павінна было кардынальна змяніць каштоўнасці, светапогляд і паводзіны новых жыхароў постсавецкай прасторы.

Аналагічныя ацэнкі гучалі і працягваюць гучаць у экспертнай супольнасці, якая канцэнтруецца на пытаннях геапалітыкі. Яшчэ ў 2005 годзе з'явілася такая радыкальная геапалітычная формула: «постсавецкай прасторы больш няма». Пад ёй разумелася тое, што інерцыя постсавецкага адзінства саступае месца логіцы аўтаномных і часта знешніх працэсаў, якія закранаюць тыя ці іншыя кавалкі некалі адзінага Саюза.

Нарэшце, у эканоміцы сусветны крызіс прымушае краіны задумвацца пра тое, якім чынам можна выжываць у новых жорсткіх умовах. Адказ знаходзяць у еўразійскай інтэграцыі, падкрэсліваючы, што яна «не з'яўляецца адраджэннем СССР ні ў якім выглядзе».

І гэта ўсё, безумоўна, правільна. Свет змяняецца, чапляцца за мінулае не варта. Аднак сярод часткі моладзі мы бачым моду на саветызм (прынамсі, у эстэтычным плане). Большасць геапалітычных ацэнак у інфармацыйнай прасторы даецца ў рамках апазіцыі «Расія супраць Захаду». Нарэшце, у эканоміцы велізарная колькасць новых інтэграцыйных ініцыятыў зводзіцца, па сутнасці, альбо да аднаўлення разбураных пасля распаду СССР сувязяў, альбо да рэалізацыі тых планаў эканамічнага развіцця, якія былі выпрацаваны яшчэ савецкімі кіраўнікамі.

У чым прычына такой бясконцай адсылкі да «нядаўняга мінулага»?

Напэўна, у тым, што ў народаў, якія жывуць на постсавецкай прасторы, праз больш чым 20 гадоў пасля разбурэння адзінай краіны так і не з'явілася новай вялікай светлай будучыні — ні адзінай, ні паасобнай. Акрыяць пасля катастрафічнай паразы — распаду краіны — «на хаду», «паміж справай» не атрымалася. Тыя ідэалы, дзеля якіх тая краіна руйнавалася, аказаліся скляпанымі на Захадзе фальшыўкамі другога гатунку. А новых ідэалаў, якія б натхнялі грамадства, так і не было створана.

Што ў такой сітуацыі неабходна рабіць?

Магчыма, варта прытрымлівацца вядомай ленінскай формулы аб тым, што перш чым аб'ядноўвацца, неабходна спачатку размежавацца. Не ў тым сэнсе, каб псаваць адносіны, распальваць саветафобію і іншыя разбуральныя тэндэнцыі. А ў тым сэнсе, каб «паглядзець ўнутр сябе», вярнуцца да вытокаў, яшчэ раз перагледзець нашы гістарычныя шляхі і зразумець, якія ж падставы (але і абмежаванні!) для яднання, інтэграцыі і будаўніцтва агульнай будучыні ёсць там, у нашай гісторыі, культуры.

Гэтая вельмі складаная задача не вырашаецца ў рамках аднаго або нават некалькіх мерапрыемстваў. Аднак пачынаць яе вырашаць неабходна. І чым хутчэй, тым лепш. Менавіта таму сімвалічным і правільным з'яўляецца такое супярэчлівае спалучэнне ў назве цяперашняга медыяфоруму слоў «Партнёрства ў імя будучыні» і «гісторыка-культурная спадчына як фактар яднання».

У праграме VIII Беларускага міжнароднага медыяфоруму акцэнт робіцца, перш за ўсё, на «мяккую» гісторыю і культуру — мову, літаратуру, тэатральнае мастацтва і гэтак далей. Бо было б нядрэнна пагаварыць і пра такую важную рэч, як, напрыклад, тэхналагічная культура, якая адыгрывае не меншую ролю ў забеспячэнні нашага цывілізацыйнага адзінства.

Але заўсёды трэба з чагосьці пачынаць. Няхай гэта будзе пачатак вялікай змястоўнай работы на нашай усё яшчэ постсавецкай прасторы.

**Юрый ЦАРЫК, палітычны аналітык, кіраўнік Беларускай групы развіцця.**

# ЯК СПЫНІЦЬ СЯМЕЙНАГА ТЫРАНА?

**Людзі розняцца па шматлікіх прыкметах. У залежнасці ад абстаноўкі гэтая няроўнасць набывае розныя адценні — па ўзросце ці па паходжанні. А ў сям'і, бывае, пераходзіць у хатні гвалт. Гэтай праблеме быў прысвечаны адмысловы семінар, які адбыўся ўчора ў сталічнай гасцініцы Crown Plaza. Арганізатарамі выступілі чатыры пастаянныя камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі разам з Фондам ААН у галіне народанасельніцтва.**

— Мы павінны зыходзіць з таго, што ў мужчын і жанчын мусяць быць аднолькавыя статус і ўмовы дзейнасці. Біялагічныя адрозненні ўплываюць на гэта нязначна. Куды большая розніца сацыяльная, — падкрэсліў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны краіны Аляксандр Румак. — Напрыклад, зараз Беларусь займае 24-е месца ў свеце па прадстаўніцтве жанчын у органах улады. Але на сямейным узроўні праблема дыскрымінацыі дагэтуль не вычарпана.

Пры фізічным гвалце сямейнага злачынцу яшчэ можна прыцягнуць да адказнасці. Але калі гаворка заходзіць пра псіхалагічны ці эканамічны ціск, тут існуючыя законы не ўсёмагутныя. Прытым церпяць не толькі жанчыны, але і дзеці, інваліды, пажылыя людзі...

Па звестках начальніка ўпраўлення прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС Алега Каразея, толькі кожная восьмая сям'я вырашае свае спрэчкі без рукапрыкладства ці гучных скандалаў. Штогод праваахоўнікі рэгіструюць каля двухсот тысяч зваротаў на сваіх блізкіх. І гэта толькі надводная частка айсберга — па падліках, каля мільёна беларускіх жанчын зведалі, што такое сямейны гвалт. Не ўсе людзі гатовы вынесці праблему за дзверы свайго дома, часта элементарна баючыся расправы.

— Штогод ад рук сваіх блізкіх у краіне памірае больш за сто чалавек. Колькасць тых, хто атрымлівае цяжкія цялесныя пашкоджанні, большая прыкладна ўдвая. Доўгі час лічба бытавых злачынстваў зніжалася, дасягнуўшы летась самага нізкага ўзроўню за апошнія дзесяць гадоў. Але сёлета мы назіраем невялікі рост, — канстатуе намеснік міністра ўнутраных спраў Беларусі, начальнік міліцыі грамадскай бяспекі Мікалай Мельчанка. — Таму трэба рабіць ухіл не на пакаранне вінаватых, а на папярэджанне такіх здарэнняў. Зараз 19 з 20 сямейных злачынстваў прыпадаюць на долю мужчын. Большую частку іх здзяйсняюць непрацуючыя людзі ў нецвярозым стане, якія раней ужо канфліктавалі з законам.

Паступова склаўся і сярэдні партрэт ахвяры сямейнага дэбашыра. Ёй крыху больш за сорак гадоў, мае сярэднюю ці незакончаную сярэднюю адукацыю, жыве ў малазабяспечанай сям'і ў сельскай мясцовасці.

Другі год у Беларусі дзейнічае маштабная інфармацыйная кампанія «Дом без гвалту». Падчас яе кожны чалавек можа атрымаць кансультацыі прафесійных спецыялістаў па сямейных праблемах. Але ці ўсе гатовы падзяліцца там сваёй бядой, «вынесці смецце з хаты»?

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

НАВІНЫ. ПАДЗЕІ. ФАКТЫ

## НА ПОЛАЧЧЫНЕ Ў ЛЯСЫ НЕЛЬГА

**У Полацкім раёне ўведзена забарона на наведванне лясоў у сувязі з высокай пажарнай небяспекай, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі.**

Полацкі раённы выканаўчы камітэт прыняў такое рашэнне ў сувязі з тым, што ў раёне ўсталяваўся 4-ы клас пажарнай небяспекі, які пераходзіць у 5-ы (самы высокі). Забарона абумоўленая тым, што на фоне пастаяннага павялічэння па гэтай тэрыторыі тэмператур ападкаў фактычна не было. У выніку ў лясах Полацкага раёна і стварылася пажаранебяспечная абстаноўка.

У выпадку ўзмацнення пажарнай сітуацыі арганізацыі Мінлясгаса будуць звяртацца з хадайніцтвам у мясцовыя органы ўлады дзеля прыняцця тымі рашэнняў па абмежаванні ці забароне наведвання лясоў, паколькі гэта найбольш дзейная мера папярэджання лясных пажараў, якія ўзнікаюць з-за парушэння насельніцтвам правілаў пажарнай бяспекі.

## НАГРУЗКІ ЧАСОВА АБМЯЖУЮЦЬ

**З 20 мая па 31 жніўня на рэспубліканскіх дарогах будуць дзейнічаць часовыя абмежаванні нагрузак.**

У дзённы час сутак (з 11.00 да 21.00 уключна) пры тэмпературы паветра больш за 25 градусаў абмяжоўваецца рух транспартных сродкаў з нагрузкай на адзіночную вось больш 6 тон па рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах з асфальтабетонным пакрыццём. Рух указанага аўтатранспарту дазволены ў начны час з 21.00 да 11.00.

Як удакладнілі ў прэс-службе Мінтранса, часовыя абмежаванні не распаўсюджваюцца на перавозкі пасажыраў, жывой жывёлы, кветак, грузаў гуманітарнай дапамогі, бетонных і асфальтабетонных сумесяў, небяспечных грузаў і грузаў, якія хутка псуюцца, збожжа, камбікармоў і перавозкі, якія звязаны з папярэджаннем ці ліквідацыяй надзвычайных сітуацый, а таксама на транспартныя сродкі, што выкарыстоўваюцца пры ўтрыманні аўтамабільных дарог.

На аўтамабільных дарогах будуць устаноўлены часовыя дарожныя знакі, для транспартных сродкаў, якія пападаюць пад абмежаванні, будуць вызначаны пляцоўкі і месцы адстою. За перасоўваннем «цяжкавагавікоў» будзе арганізаваны пастаянны кантроль. За пашкоджанне дарог, выкліканае рухам з парушэннем абмежаванняў, вінаватыя будуць прыцягвацца да адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам.

## ЦЯГНУЎСЯ ЭЛЕКТРАПРОВАД АД СЛУПА ДА ВАДЫ...

**Работнікі Мядзельскай міжрайінспекцыі на возеры Нарач знайшлі провад, які цягнуўся з вады да апоры лініі электраперадач...**

Для яго адключэння з мэтай папярэджання далейшай гібелі рыбы выклікалі дзяжурную брыгаду Мядзельскага раённага вузла электрасувязі. З дна возера паднялі ізаляваны провад даўжынёй 115 метраў, агалены провад даўжынёй 65 метраў, а таксама 11 асобін незаконна здабытага вугра агульнай вагой больш за 12 кілаграмаў. Па гэтым факце Мядзельскі РАУС завёў крымінальную справу. Як удакладнілі ў прэс-службе Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, шкода навакольнаму асяроддзю, нанесеная незаконнай здабычай рыбы, склала 44 мільёны рублёў (440 базавых велічынь).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## АКВАПАРК У «ДРЫМЛЭНДЗЕ» АДКРЫЕЦЦА ЎЖО ГЭТЫМ ЛЕТАМ

**Завяршыць будаўніцтва адкрытага аквапарка ў «Дрымлэндзе» плануецца надыходзячым летам.**

— Водныя атракцыёны павінны быць гатовы да 1 жніўня, але дата яшчэ можа мяняцца, — расказаў начальнік дырэкцыі аб'екта, што будуецца, Ігар Еўстаф'еў. — Пакуль жа да сярэдзіны чэрвеня будаўнікі здадуць кавярню, грамадскія прыбіральні, тэхнічныя памяшканні. Зараз пракладваюць інжынерныя сеткі і ўстанаўліваюць спецыяльнае абсталяванне для водных комплексаў, наперадзе яшчэ добраўпарадкаванне тэрыторыі.

Пабудаваць адкрыты аквапарк на вуліцы Арлоўскай спрабавалі ўжо даўно. Мяняліся канцэпцыі і заказчыкі. І ўсё ж некалькі гадоў таму справа зрушылася з мёртвага пункта: на ўчастку пачаліся работы. Аднак даты адкрыцця воднага комплексу некалькі разоў мяняліся.

— На ўчастку складаныя геафізічныя ўмовы, таму весці пэўныя работы няпроста, — патлумачыў намеснік начальніка дырэкцыі Сяргей Багдановіч. — Напрыклад, даводзіцца паніжаць узровень грунтовых водаў (а тут праходзіць старое рэчышча Свіслачы), прычым зрабіць гэта звычайнымі метадамі праблематычна. Аднак прымаем усе захады, каб хутчэй справіцца з праблемамі і адкрыць аквапарк. У гэтым сезоне будоўля ўсё ж фінішуе.

## У МІНСКУ ПРОЙДЗЕ ВОГНЕННАЕ ШОУ «МІФФ-2013»

**Міжнародны фестываль агню «Міфф-2013» пройдзе ў беларускай сталіцы 24 і 25 мая на стадыёне «Трактар».**

У піратэхнічным шоу возьмуць удзел лепшыя тэатры агню Украіны, Расіі, Беларусі, Літвы, Польшчы — усяго больш за 70 удзельнікаў. У прыватнасці, запрошаны пераможца леташняга фестывалю — Тэатр агню з Еўпаторыі «Гефест», які скарыў гледачоў галавакружнымі дэкарацыямі і спецэфектамі. Ён парадуе публіку новай праграмай і паўторыць на біс сваю леташнюю.

**«Мінск—Навіны».**

## СУМНАЯ СТАТЫСТЫКА «ЧУМЫ XX СТАГОДДЗЯ»

**У Віцебскай вобласці, па звестках на пачатак мая, зарэгістравана каля 790 выпадкаў ВІЧ-інфіцыявання. Для параўнання, у цэлым па Беларусі — больш за 14,6 тысячы.**

— Найбольш небяспечнымі з'яўляюцца: Лёзненскі раён — 38 выпадкаў, Талачынскі раён — 46 выпадкаў, Гарадоцкі раён — 33, Полацк — 107, Дубровенскі раён — 16, Віцебскі раён — 32, Полацкі раён — 2, Віцебск — 272 выпадкі, — паведамілі ў аддзеле прафілактыкі ВІЧ/СНІД Віцебскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. — Змяняецца ўзроставая структура. У эпідпрацэс у асноўным уцягнута насельніцтва працаздольнага ўзросту (25-39 гадоў) — 56,1% выпадкаў.

Значна павялічылася доля інфіцыявання ва ўзроставай групе старэйшых за 30 гадоў: з 36,0% у 2006 годзе да 63,0% летась, а за 4 месяцы бягучага года — 80%. Высокая ўдзельная вага адзначаецца ва ўзроставай групе 35-39 гадоў: 27,2%. Як дадалі ў аддзеле, адзначаецца ўстойлівая тэндэнцыя да павелічэння колькасці выпадкаў палавога шляху перадачы хваробы. За ўвесь перыяд назірання ад ВІЧ-інфіцыяваных маці нарадзілася 119 дзяцей, у 16 з якіх пацверджаны дыягназ «ВІЧ-інфекцыя». На Віцебшчыне зарэгістравана 147 смяротных выпадкаў сярод ВІЧ-інфіцыяваных, з іх у стадыі СНІД — 88.

19 мая ў Міжнародны дзень памяці людзей, якія памерлі ад СНІД, сярод іншага былі арганізаваны тэматычныя акцыі, мастацкія выставы, розныя мерапрыемствы, прысвечаныя праблеме ВІЧ/СНІД. У храмах вобласці адбыліся памінальныя малебны, былі запалены свечкі ў памяць аб памерлых.

## У ІЗРАІЛЬ — КАБ НЕ ПАСАДЗІЛІ...

**Праз 7 гадоў затрымалі вадзіцеля, па віне якога загінулі дзве дзяўчыны. Ад беларускага правасуддзя ён хаваўся аж у Ізраілі.**

Як паведамілі ў Сенненскім раённым аддзеле ўнутраных спраў, гэты ураджэнец Віцебска яшчэ ў 2006 годзе трапіў у аварыю падчас абгону транспарту. Яго «Таёту» занесла і выкінула на сустрэчную паласу, па якой рухалася «Газэль». У выніку сутыкнення машын дзяўчаты — пасажыркі «Таёты» — загінулі.

Каб пазбегнуць пакарання, кіроўца іншамаркі выехаў у Ізраіль. І толькі ў канцы мінулага года яго затрымалі і даставілі ў Беларусь. Нядаўна вінаватага ў ДТЗ са смяротным вынікам пазбавілі волі на 4,5 года, а таксама пазбавілі права кіраваць транспартнымі сродкамі на працягу 5 гадоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**



Прадаўцы Крысціна ШКРАБО і Кацярына КУЦКОВА.

# Любімая газета з водарам кавы

**Новы павільён № 259 «Белсаюздрука», што размясціўся акурат каля станцыі сталічнага метро «Уручча», ужо мае сваіх пастаянных кліентаў. Бо гандлююць тут, натуральна, не толькі перыёдыкай. Асартымент тавараў на прылаўках хутчэй нагадвае міні-маркет з кафэтэрыям. Тут можна не толькі набыць любімую газету, але і выпіць кубачак смачнай кавы.**

— Эспрэса і капучына, латэ, шакаладны і арэхавы мока... Кожную раніцу мінчане забягаюць да нас, каб выпіць каву і прачнуцца, — усміхаецца прадавец Кацярына КУЦКОВА. — Бо ў будныя дні мы працуем з 6.30 раніцы!

— Акрамя газет, больш за ўсё прадаюцца кнігі — маладыя мамы з задавальненнем набываюць для сваіх дзетак цікавую і карысную прадукцыю, — дадае прадавец Крысціна ШКРАБО.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**




## НА АНТЭНУ СПАТРЭБІЦЦА ДАЗВОЛ

**Урад Беларусі зацвердзіў Палажэнне аб умовах і парадку ўстаноўкі на дахах і фасадах шматкватэрных жылых дамоў індывідуальных антэн і іншых канструкцый, а таксама Палажэнне аб парадку рэканструкцыі шматкватэрных, блакіраваных і аднакватэрных жылых дамоў. Адпаведнае рашэнне прынята пастановай Савета Міністраў № 384 ад 16 мая, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.**

Дакументам вызначаны парадак узгаднення ўстаноўкі спадарожнікавых антэн. У прыватнасці, устаноўка інжынернага абсталявання на дахах і фасадах шматкватэрных жылых дамоў ажыццяўляецца пасля атрымання дазволу мясцовага выканаўчага і распарадчага органа ў адпаведнасці з праектнай дакументацыяй. Для атрымання дазволу на ўстаноўку інжынернага абсталявання юрыдычная асоба або індывідуальны прадпрымальнік, якія ініцыіруюць устаноўку, заяўляюць аб сваім намеры ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган, растлумачылі ў прэс-службе ўрада.

У Палажэнні гаворыцца, што пры разглядзе гэтай заявы ініцыятар ва ўзгоднены з ім час абавязаны прадаставіць доступ у жылое і (або) нежылое памяшканне прадстаўнікам арганізацыі, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду і (або) прадастаўляе жыллёва-камунальныя паслугі. Па выніках агляду фасада, гэта значыць вонкавых сцен жылога і (або) нежылога памяшканняў, або даху шматкватэрнага жылога дома ў залежнасці ад месца ўстаноўкі інжынернага абсталявання складаецца акт іх тэхнічнага агляду, у якім прыводзяцца звесткі аб тэхнічным стане фасада або даху.

«На аснове дакументаў, прадстаўленых ініцыятарам, і акта тэхнічнага агляду мясцовы выканаўчы і распарадчы орган не пазней чым праз адзін месяц з дня падачы заявы прымае рашэнне аб дазволе ўстаноўкі інжынернага абсталявання або адмове з указаннем матыву адмовы і паведамляе аб гэтым ініцыятару», — падкрэслілі ва ўрадзе, дадаўшы, што адмова можа быць абскарджана ініцыятарам у вышэйшым органе або ў судзе. Такім чынам, самавольная ўстаноўка інжынернага абсталявання забаронена.

Пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

■ Крэатыў

# Зніжка за заказ па-беларуску

***— Ці сапраўды вы прадастаўляеце зніжку тым кліентам, якія размаўляюць па-беларуску?***

***— Так, сапраўды, зніжка 10 %.***

Так пачалася мая размова па тэлефоне, нумар якога пабачыла на адным з білбордаў у Гомелі. Фірма прапанавала выраб корпуснай мэблі. Паколькі мне сапраўды патрэбен пісьмовы стол, падумала: чаму не скарыстацца такой прывабнай прапановай?

Потым мы пазнаёміліся з менеджарам Віктарам Савічам, які, дарэчы, гэтую ідэю і прапанаваў сваім наймальнікам. Ён падрабязна і на роднай мове расказаў мне пра магчымасці іх фірмы.

— Мы робім усё тое, што робяць і іншыя, хто займаецца вытворчасцю корпуснай мэблі, але яшчэ і крыху больш. Бо ў нас ёсць каваныя вырабы, на якія таксама распаўсюджваецца «беларускамоўная» зніжка. Калі вы хочаце зрабіць заказ, мы выязджаем да вас, робім 3D-дызайн. Пасля гэтага, калі вас зацікавіла наша прапанова, распрацоўваем кошт з улікам зніжкі і падпісваем дагавор. Дарэчы, кошты вы самі можаце параўнаць — у нас танней за іншых. Тым больш мы даём гарантыю на сваю прадукцыю.

Зразумела, мне стала цікава, ці шмат кліентаў ужо «клюнулі» на магчымасць сэканоміць з дапамогай мовы за той месяц, колькі білборд са слоганам «На сваяках не зарабляем» усталяваны ў горадзе.

— Паўтара дзясятка заказаў са зніжкамі, — адказвае Віктар. — Людзі не заўсёды ўпэўнена размаўляюць па-беларуску, але ж яны імкнуцца гэта рабіць, хоць і збіваюцца. Часам пераходзяць на рускую мову, але ж усё роўна спрабуюць размаўляць па-беларуску. Калі мы з імі часцей сустракаемся, заўважаю, што ў іх лепш атрымліваецца — новыя словы ўводзяць у лексікон. Яшчэ 30 дагавароў знаходзяцца ў стадыі распрацоўкі — мы пакуль не ведаем, ці ўсе згодзяцца іх падпісаць. Важна, што заўсёды размова адбываецца з добрай усмешкай, з цудоўным настроем. І кліент заўсёды будзе памятаць пра тое, як ён замаўляў сваю мэблю менавіта па-беларуску.

У Гомелі тых, хто прапагандуе мову, няшмат. І таму вельмі прыемна, што з'явіліся і іншыя білборды, якія, напрыклад, з дапамогай малюнкаў перакладаюць некаторыя вельмі прыгожыя словы і растлумачваюць іх для ўсіх: *агрэст — крыжовник, кавун — арбуз, ажына — ежевика*...

— Гэта ж цікава — размаўляць па-беларуску, — разважае мой суразмоўца, які, аказваецца, адукацыю атрымліваў у Гомельскім дзяржаўным універсітэце па спецыяльнасці «руская мова і літаратура». — Сёння я цэлы дзень размаўляў па-руску і не адразу магу пераключыцца на беларускую. Але ж крыху пагутарыў — і гавару значна лепш. У мяне ёсць некалькі сяброў, якія размаўляюць па-беларуску. Людзям я заўсёды адказваю на той мове, на якой да мяне звяртаюцца. Каб падтрымліваць беларускамоўную «форму», чытаю беларускія творы: Караткевіча, Быкава.

Сузаснавальнік групы кампаній «Славія» Генадзь Кустаў, які даў «зялёнае святло» ўвасабленню ініцыятывы свайго падначаленага, расказаў, што сам вырас у вёсцы і ў дзяцінстве размаўляў на жыткавіцкай гаворцы:

— Я вырас у вёсцы Вязаў Лес, што ў Жыткавіцкім раёне. У мяне настальгія па свайму, па роднаму засталася. Таму так лягла на душу гэтая ідэя. І зараз вельмі люблю лес, паляванне, рыбалку і часта бываю ў тых населеных пунктах, дзе больш размаўляюць па-беларуску, чым па-руску. Такі білборд у Гомелі ў нас пакуль адзін. Але зараз разглядаем і іншыя варыянты, бо ў нашай кампаніі шмат розных напрамкаў, напрыклад, гандаль ювелірнымі вырабамі. Неўзабаве плануем адкрыць краму ў Мінску. Не выключана, што яе дызайн будзе распрацаваны менавіта ў беларускім стылі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара**




■ Незвычайная біяграфія

# СТРЭЛЫ З МІНУЛАГА

**Шлях на фронт для палкоўніка ў адстаўцы Аляксандра Ягоравіча Афанасьева пачынаўся ў родных тамбоўскіх краях, юнак быў прызваны ў кастрычніку 1942-га. На вакзале навабранца праводзілі бацька, удзельнік Першай сусветнай вайны, кавалер Георгіеўскіх крыжоў, чырвоны партызан, і маці. А потым былі нядоўгая дарога ў вагонах-цяплушках і фарсіраваная, напружаная вучоба ў Тамбоўскім ваенна-кулямётным вучылішчы.**

Зіма выдалася тады суровая, і дровы для ацяплення тром тысячам курсантаў вучылішча прыходзілася нарыхтоўваць за 18 кіламетраў ад месца дыслакацыі, перацягваючы іх на сабе. Транспарту не было. Аляксандр быў фізічна дужым і вынослівым. Відаць, таму і спадабаўся ён у ліпені 1943 года прадстаўнікам паветрана-дэсантных войскаў, трапіўшы пад Звянігарад, дзе даўкамплектоўвалася 100-я гвардзейская дывізія ПДВ.

А потым давялося ліхім дэсантнікам стаць звычайнымі пехацінцамі. І злучэнне іх пачало называцца 100-й гвардзейскай стралковай дывізіяй. Ваяваць наваспечаныя пехацінцы пачалі на Карэльскім фронце. А там фінскія аўтаматчыкі-«зязюлі» бязлітасна білі з дрэў, даючы адначасова наводку артылерыі. Падчас аднаго з артабстрэлаў, як толькі Аляксандр паспеў разаслаць плашч-палатку, снарад тут жа трапіў у самы яе край. На шчасце, гэты варожы «сюрпрыз» так і не ўзарваўся.

Шчаслівы франтавы лёс, як кажуць. Крыху пазней узвод Афанасьева зноў трапіў пад абстрэл. Іх камандзір, капітан Кукса, загінуў у першую ж хвіліну. Аляксандра ж выратавала салдацкая каска, якая змякчыла ўдар асколка. Але ён усё ж быў паранены і апынуўся на шпітальным ложку. У другі раз ад пападання асколка ў грудзі сяржанта Афанасьева цудам выратавала стальная рама яго аўтамата.

Аляксандру Ягоравічу часта ўспаміналіся баі ў Карэліі летам 1944-га і фарсіраванне ракі Свір, пантонны мост і страшэнны артабстрэл, калі яго баявыя сябры загінулі. Каб праравацца праз перасечаную, багністую мясцовасць, прыйшлося, не разбіраючы дарогі, літаральна ехаць па мёртвых целах сваіх таварышаў. Гэтая страшная, трагічная карціна дагэтуль паўстае перад вачамі ветэрана. Бо такога і ворагу не пажадаеш. Але іншага выйсця не было. Інакш — гібель для ўсіх тых, хто застаўся ў жывых.

Але самае страшнае было яшчэ наперадзе, на тэрыторыі Венгрыі, куды дывізію перакінулі ў студзені 1945-га. Аляксандра Афанасьева, як быццам бы «загінулага», ледзь не пахавалі ў брацкай магіле. Здарылася ўсё пасля кровапралітнага бою каля венгерскага возера Балатон. Усіх загінулых збіраліся хутка пахаваць у глыбокай варонцы. Магілу капаць у той крытычнай сітуацыі не было калі. Прынеслі туды і цяжкапараненага сяржанта Афанасьева, які быў без прытомнасці. Яго палічылі забітым. Вось тут зноў адбыўся цуд. Санітар, зірнуўшы на целы загінулых, машынальна нагнуўся, каб паправіць ненатуральна вывернутую руку сяржанта, і адчуў у таго слабы пульс. Так Аляксандра Афанасьева ў прамым сэнсе слова «выцягнулі з магілы» і ў чарговы раз адправілі ў шпіталь, дзе яго з вялікай цяжкасцю выходзілі армейскія ўрачы. Непрадказальны франтавы лёс ізноў аказаўся літасцівым да маладога воіна...

Неяк у адным з венгерскіх гарадкоў пачулі нашы байцы з падвала разам са спалоханымі жаночымі галасамі камандны мужчынскі вокрык і клацанне збраявых затвораў. Адзін з байцоў падаў каманду тым, хто хаваўся, — неадкладна выходзіць наверх. Не дачакаўшыся рэакцыі ў адказ, хацеў ужо было кінуць у злашчасны падвал гранату. Але Афанасьеў рэзка асадзіў яго: «Ні да чаго нам гэтая «брацкая магіла»! Вайна ж заканчваецца!». І тут жа, даўшы кулямётную чаргу па верхніх паверхах дома, прымусіў выйсці са схованкі з паднятымі рукамі і цывільных мясцовых жыхароў, і салдат праціўніка. Тым самым Аляксандр Афанасьеў выратаваў і першых, і другіх.

«...Не, не помсціць прыйшлі савецкія салдаты пад авеянымі баявой славай сцягамі ў Венгрыю і Чэхаславакію, Германію і Аўстрыю, іншыя дзяржавы, — успамінаў Аляксандр Ягоравіч, — а вызваліць Еўропу і свет ад нацызму. У гэтым мы бачылі сваё прызначэнне»...

Аляксандр Ягоравіч апынуўся ў ліку тых савецкіх воінаў, якія сустрэліся з амерыканскімі саюзнікамі на Эльбе. У размяшчэнне савецкіх войскаў амерыканцы прыбылі на джыпах усе, як адзін, у белых пальчатках. Ротны загадаў Аляксандру ўсяляк забаўляць амерыканскіх гасцей: бойкі дваццацігадовы сяржант быў вялікім мастаком па частцы прыпевак, анекдотаў, жартаў і прымавак. Ну а далей пачалося вядомае франтавое — «махнём не гледзячы». Пакуль амерыканцы разглядвалі савецкія ордэны ды медалі і выменьвалі сабе на сувеніры салдацкія зорачкі і гузікі, знаходлівыя чырвонаармейцы зрабілі свой «чэнч», паспеўшы ў іх «вытаргаваць» узамен пару джыпаў. Янкі былі не ў крыўдзе. І рассталіся яны сябрамі.

Пасля вайны, адвучыўшыся ў Новасібірску, Аляксандр Ягоравіч доўгія гады служыў у розных падраздзяленнях асобага аддзела КДБ СССР па Беларускай ваеннай акрузе і ва Усходняй Германіі. Там давялося ўдзельнічаць у распрацоўцы і выкрыцці шэрагу агентаў саперніка...

У прыватнасці, грамадзянка Усходняй Германіі, фрау Мансфельд больш як дзесяць гадоў небеспаспяхова «працавала» перакладчыцай «па будаўнічай лініі» ў савецкага каменданта горада Шверына. Па сумяшчальніцтве з'яўлялася і рэзідэнтам заходнегерманскай разведкі. Яе выкрыццё аказалася няпростай справай, паколькі фрау аддавала перавагу хітрай безасабовай сувязі са сваёй агентурай. Зрэшты, пасля ўзвядзення ў жніўні 1961 года Берлінскай сцяны яна была вымушана парушаць патрабаванні канспірацыі. На чым і «пагарэла».

Іншая шпіёнская «гісторыя» адбылася ўжо ў Беларусі. У полі зроку аказаўся афіцэр, які прайшоў перападрыхтоўку для працы на найноўшай сакрэтнай апаратуры зенітна-ракетных войск. Як высветлілася, ім зацікавілася канадская разведка ў асобе свайго дыпламатычнага прадстаўніка. Маральнае падзенне афіцэра пачалося яшчэ ў перыяд нацысцкай акупацыі Бранскай вобласці, калі яго бацька хлебам-соллю сустракаў акупантаў, супрацоўнічаў з імі. І ўцягнуў у гэты непрыстойны занятак свайго сына...

Пасля вайны шэрагу нацысцкіх злачынцаў удалося ўцячы за акіян, прыхапіўшы з сабой адпаведныя картатэкі і дасье. Так «стрэл з мінулага» і спасціг афіцэра супрацьпаветранай абароны, які за ўсё ім зробленае панёс потым заслужанае пакаранне.

На маё пытанне, што хацеў бы Аляксандр Ягоравіч змяніць у сваім жыцці, калі б выдаўся такі выпадак, ветэран, не задумваючыся, адказаў: «Я, як былы франтавік, прайшоў вялікую школу жыцця. Але калі б была магчымасць пачаць зноў, то пайшоў бы тым жа шляхам. Іншага не дадзена»...

**Мікалай СМІРНОЎ**

■ Беларусь і свет

# В'ЕТНАМ УСЁ БЛІЖЭЙ



**В'етнам становіцца ўсё больш важным партнёрам Беларусі з кожным годам. Фактараў, якія на гэта ўплываюць, некалькі. Вядома ж, у В'етнаме памятаюць тую ваенную дапамогу, якую БССР аказвала краіне падчас справакаванай замежнікамі грамадзянскай вайны. Немалаважнай была і дапамога ў аднаўленні эканомікі пасля здабытай у вайне перамогі. Вялікае значэнне мела і садзейнічанне ў аказанні адукацыйных паслуг — больш як тысяча грамадзян В'етнама навучаліся сучасным прафесіям у беларускіх ВНУ і прымянілі атрыманыя веды ў аднаўленні эканомікі краіны. Многія з іх у далейшым занялі значныя пасты ва ўрадзе. Не дзіўна таму, што В'етнам прызнаў незалежнасць Рэспублікі Беларусь 27 снежня 1991 г. адным з першых.**

Іншым важным фактарам хуткага развіцця адносін з'яўляецца тая ўвага, якую Беларусь надае перспектывам паскарэння кантактаў з В'етнамам. Калі многія постсавецкія рэспублікі адвярнуліся ад сацыялістычнага В'етнама ў выніку павальнай лібералізацыі ў 1990-х, то Беларусь такую памылку не зрабіла. Беларуская знешняя палітыка прагматычная — курс ідэалагічнага развіцця з'яўляецца ўнутранай справай кожнай краіны, паколькі толькі яе ўласныя жыхары здольныя зразумець, што ім трэба. У выніку ў В'етнаме цэняць паважлівае стаўленне беларускага кіраўніцтва і заўсёды пацвярджаюць гатоўнасць аказаць садзейнічанне нашай краіне ў міжнародных арганізацыях. Беларусь таксама аказвае В'етнаму садзейнічанне ў вырашэнні яго праблем на міжнародным узроўні.

Вялікае значэнне мае і развіццё глабалізацыі: у свеце, у якім межы становяцца ўсё больш блізкімі і празрыстымі для кантактаў з-за імклівых камунікацый, для дзяржаў усё больш важным становіцца ведаць сваіх сяброў і сапернікаў, фарміруючы прэферэнцыі для зносін.

Нарэшце, спрыяе развіццю беларускіх адносін з В'етнамам і еўразійская інтэграцыя — агульны рынак Расіі, Беларусі і Казахстана становіцца значным для В'етнама, стымулюючы гатоўнасць наладжваць кантакты з ім. Гэтая гатоўнасць такая вялікая, што з 2010 года вядуцца перамовы па Пагадненні аб зоне свабоднага гандлю паміж Мытным саюзам Беларусі, Казахстана і Расіі і В'етнамам. У выніку 27—29 сакавіка 2013 г. у Ханоі прайшоў першы раўнд перамоў па гэтым пагадненні. На працягу 2013 года плануецца правесці яшчэ тры раўнды, і цалкам магчыма, што ўжо ў 2014 годзе зона свабоднага гандлю пачне функцыянаваць. Акрамя эканамічных выгад для ўсіх бакоў, такі сцэнарый будзе мець і выгадныя для ўдзельнікаў еўразійскай інтэграцыі геапалітычныя наступствы. Наяўнасць у такіх сур'ёзных краін, як В'етнам, інтарэсу да стварэння зоны свабоднага гандлю з удзельнікамі тройкі, падкрэслівае, што яе значэнне ў сусветнай геапалітыцы расце. А ўлічваючы, што паралельна ідуць перамовы па гэтым пытанні і з іншымі краінамі, будучы Еўразійскі эканамічны саюз зможа ў 2015 г. прадэманстраваць нядрэнны зачын.

Зыходзячы з вышэйназваных фактараў, візіт кіраўніка ўрада В'етнама Нгуена Тан Зунга ў Беларусь, які адбыўся 15—17 мая, аказаўся вельмі плённым. Падпісана ў тым ліку 10 камерцыйных кантрактаў на агульную суму звыш 100 млн дол., абмеркаваны і іншыя праекты.

Адной з сур'ёзных праблем у развіцці эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі з В'етнамам доўгі час быў недахоп магчымасцяў па фінансаванні новых праектаў. І беларуская эканоміка, і в'етнамская поўныя патэнцыйна выгадных праектаў, але адным з ключавых аспектаў заўсёды з'яўляецца пытанне: дзе знайсці неабходныя для гэтага фінансы? Таму падчас перамоў з в'етнамскім прэм'ерам беларускі бок прапанаваў механізмы фінансавай падтрымкі сумесных з В'етнамам кампаній і праектаў.

На думку беларускага прэм'ер-міністра, гэта дазволіць падвоіць таваразаварот з В'етнамам у бліжэйшыя тры гады. Калі ўлічыць, што па выніках 2012 года ён склаў 184,7 млн долараў, то задача пастаўлена дастаткова сур'ёзная. Садзейнічаць яе рэалізацыі будзе ў тым ліку і створаны восенню 2012 г. у Ханоі Гандлёвы дом «Беларусь — В'етнам». Кантраляваць і заахвочваць развіццё тавараабароту будзе Беларуска-В'етнамская міжурадавая камісія па гандлёва-эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве.

**На працягу 2013 года плануецца правесці яшчэ тры раўнды, і цалкам магчыма, што ўжо ў 2014 годзе зона свабоднага гандлю пачне функцыянаваць.**

Безумоўна, сур'ёзны ўклад унясе і Беларуска-В'етнамская камісія па навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, якая рэалізуе Выканаўчую праграму навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва на 2012—2013 гады і на перспектыву да 2015 года. Адным з перспектыўных напрамкаў супрацоўніцтва можа стаць здабыча беларускімі кампаніямі карысных выкапняў на тэрыторыі В'етнама і рэалізацыя аналагічных сумесных праектаў у супрацоўніцтве з в'етнамскімі кампаніямі ў Азіі. Хацелася б, каб з часам беларуска-в'етнамскія адносіны выйшлі на той узровень эканамічнай кааперацыі, які ўжо цяпер дасягнуты з Венесуэлай.

**Сяргей КІЗІМА, загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук.**


Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ на газету** (індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «ПЛАЦДАРМ», «ІГУМЕНСКІ ТРАКТ»

Колькасць камплектаў

на 2013 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму (прозвішча, ініцыялы)

Куды (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету** (індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «ПЛАЦДАРМ», «ІГУМЕНСКІ ТРАКТ»

Кошт: падпіскі ________ руб.; пераадрасоўкі ________ руб. Колькасць камплектаў

на 2013 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму (прозвішча, ініцыялы)

Куды (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)


■ Бяспека руху

## ХУТКАСЦЬ ЗАБІВАЕ

**У цёплы сезон у інфармацыйных паведамленнях ДАІ пра дарожныя здарэнні ўсё часцей сталі пісаць пра тое, што кіроўцы не справіліся з кіраваннем, а далей ідуць варыянты — «ударыўся ў дрэва, перакуліўся, з'ехаў у кювет ці выехаў на сустрэчную паласу і сутыкнуўся з іншым аўтамабілем...», з наступствамі рознай цяжкасці для людзей.**



— Гэта азначае, найперш, што вадзіцель перавысіў бяспечную хуткасць руху, — каментуе інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе Магілёўскай ДАІ Таццяна Старасотнікава. — Высокая хуткасць заваражвае, але яна не дае магчымасці своечасова зарыентавацца і прыняць правільнае рашэнне. На дарозе ў адно імгненне можна страціць усё.

І вось доказы. Апошнімі днямі ў Магілёўскай вобласці адбылося некалькі сур'ёзных здарэнняў, звязаных з перавышэннем хуткасці. У Чэрыкаўскім раёне 31-гадовы вадзіцель на закругленні дарогі не справіўся з кіраваннем, мінівэн з'ехаў у кювет і перакуліўся. Аднаго з пасажыраў выкінула з аўтамабіля — ён загінуў на месцы, а вадзіцеля і яшчэ чацвярых пасажыраў з траўмамі рознай ступені цяжкасці даставілі ў бальніцу. Усе пацярпелыя, дарэчы, — грамадзяне Узбекістана.

У іншым ДТЗ загінуў 27-гадовы жыхар Магілёва, які быў за рулём адной з іншамарак, якія сутыкнуліся «лоб у лоб» у Магілёўскім раёне. Пасажыр гэтага аўтамабіля шпіталізаваны з пераломамі.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ЗА НАХАБСТВА АДКАЖА

**Упраўленнем Следчага камітэта Беларусі па Гомельскай вобласці завершана расследаванне крымінальнай справы ў дачыненні да кіроўцы аўтамабіля «БМВ Х-5», які на тэрыторыі Веткаўскага раёна аказаў супраціўленне супрацоўнікам міліцыі пры выкананні імі абавязкаў па ахове грамадскага парадку.**

Следствам устаноўлена, што 5 лютага 2013 года на выездзе з Веткі экіпаж ДПС прыняў рашэнне праверыць аўтамабіль «Форд-Транзіт», які рухаўся ў сустрэчным кірунку. Супрацоўнік ДАІ загадзя ўключыў праблісковыя маячкі на аўтамабілі і падаў сігнал аб прыпынку. Але кіроўца мікрааўтобуса не выканаў патрабаванне і працягваў рух. Пасля гэтага інспектар ДПС, уключыўшы сірэну, стаў пераследаваць мікрааўтобус, даючы каманду спыніцца. Аднак на аўтадарозе Гомель — Ветка — Чачэрск — Ямнае паміж мікрааўтобусам і аўтамабілем ДАІ ўклініўся «БМВ Х-5». Яго кіроўца стаў актыўна перашкаджаць супрацоўнікам міліцыі даганяць «Форд-Транзіт» і пры гэтым ствараў рэальную пагрозу жыццю і здароўю не толькі супрацоўнікаў міліцыі, але і іншых удзельнікаў дарожнага руху. Пасля таго, як кіроўцы аўтамабіляў «БМВ» і «Форд-Транзіт» не падпарадкаваліся неаднаразовым патрабаванням спыніцца, міліцыянеры выкарысталі табельную зброю. Кіроўца «Форд-Транзіту», які перавозіў па просьбе ўласніка мікрааўтобуса лом каляровага металу ў кірунку Расіі, быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці. Кіроўцу «БМВ Х-5», жыхару Гомельскага раёна, прад'яўлена абвінавачванне ў здзяйсненні злачынства, прадугледжанае артыкулам Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб супраціўленні супрацоўнікам органаў унутраных спраў. Крымінальная справа перададзена ў пракуратуру Гомельскай вобласці для накіравання ў суд.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ПАЖАР У АЎТО: ПАЦЯРПЕЛА ДЗІЦЯ

**Суседзі патэлефанавалі ў МНС, калі пабачылі ахоплены агнём аўтамабіль «ВАЗ-2106» у двары дома ў вёсцы Юдзічы Рагачоўскага раёна.**

Высветлілася, што 23-гадовы ўладальнік аўто пайшоў у дом, а праз некаторы час дарослыя ўбачылі, што аўтамабіль гарыць. У момант загарання ў машыне знаходзіліся трое: хлопчыкі 2009 і 2011 гадоў нараджэння і дзяўчынка 2010-га. Менавіта яна атрымала апёкі цела 2-й ступені. Пацярпелая дастаўлена ў рэанімацыйнае аддзяленне бальніцы. Прычына пажару высвятляецца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ГОРА-МАТАЦЫКЛІСТЫ

**У Брэсце і вобласці адбылося некалькі аварый па віне матацыклістаў. Некаторыя мелі трагічны фінал.**

17-гадовы жыхар вёскі Вялікая Гаць, рухаючыся на матацыкле па дарозе Івацэвічы — Пінск — Столін, збіў 83-гадовую пенсіянерку. Жанчына памерла ў бальніцы. А гора-матацыкліст з месца здарэння ўцёк, праўда, пазней быў затрыманы. Як расказала **начальнік аддзела агітацыі і прапаганды абласной аўтаінспекцыі Наталля САХАРЧУК**, юнак не меў правоў на кіраванне матацыклам.

Яна ж паведаміла і пра другое надзвычайнае здарэнне. На скрыжаванні вуліц Гаўрылава і Ленінградскай абласнога цэнтра матацыкліст выехаў на чырвонае святло і сутыкнуўся з легкавым аўтамабілем, якім кіравала жанчына. Ад удару небараку адкінула далёка ад транспартных сродкаў, і ён загінуў на месцы. У гэты дзень яму б споўніўся 31 год.

Яшчэ адзін матацыкліст 13 мая не справіўся з кіраваннем і перакуліўся ў кювет. На шчасце, і хлопец, і яго пасажырка, хоць былі без шлемаў, сур'ёзных пашкоджанняў не атрымалі. А вось за тое, што ехалі без шлемаў, быў складзены пратакол, асобныя пратаколы складзены і за тое, што вадзіцель не меў правоў на кіраванне, а матацыкл быў без рэгістрацыйных знакаў і страхоўкі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Прыватная арэнда

# ЗДЫМНЫ ПАКОЙЧЫК СТАЎ «ЗАЛАТЫМ»

## Мінімальны кошт арэнды аднапакаёвак у Мінску пераскочыў мяжу ў 300 USD

**Ажыятажны попыт на здымнае жыллё напрыканцы мінулага года выклікаў істотнае падаражанне арэнды прыватных кватэр у сталіцы. На думку спецыялістаў, сітуацыя павінна была выправіцца ўжо ў маі, калі на рынак арэнды традыцыйна трапляе дадатковы аб'ём здымных кватэр сезоннага тыпу ад «бабулек», якія мяняюць гарадскія апартаменты на дачнае жыллё. Аднак сёлета чаканая тэндэнцыя на магчымае патанненне здымных кватэр у міжсезонні ў Мінску не спрацавала. Пра сённяшняе развіццё сталічнага рынку арэнды і прагнозы на лета карэспандэнту «Звязды» расказвае намеснік генеральнага дырэктара Цэнтра гандлю нерухомасці «ПАКАДАН» Аксана ЛУКАШЭВІЧ.**






### БЮДЖЭТНЫХ КВАТЭР ПРАКТЫЧНА НЯМА

Як і тры месяцы таму, зараз на рынку назіраецца жорсткі дэфіцыт параўнальна таннага жылля. Справа ў тым, што агульная колькасць кватэр, што прапануюцца, застаецца на даволі нізкім узроўні. Так здарылася, што на 5—7 заявак ад кліентаў у агенцтвах існуе звычайна 1—2 варыянты больш-менш адпаведнай прапановы. Заяўкі на кватэры па мінімальным кошце часам выканаць увогуле немагчыма. Вельмі рэдка праз агенцтвы магчыма адшукаць зусім слабенькія бюджэтныя кватэры за 300 долараў. Звычайна гэта маленькія «хрушчоўкі» з савецкай мэбляй у даволі старых дамах і не ў лепшых раёнах. Гэта могуць быць кватэры з праблемнымі суседзямі ці побач з шумнай і бруднай вытворчасцю. Раней падобнае жыллё каштавала ў разы танней.

**Значна больш варыянтаў па стандартных двухпакаёвых кватэрах прыпадае на жыллёвыя памяшканні па кошце ад 420 да 450 долараў. Аднак і па такім цэнніку сапраўды якаснага жылля ўжо не хапае.**

Галоўны цэннік па аднапакаёвых кватэрах цяпер дасягнуў 320—350 долараў. Разам з тым па гэтым сегменце не ўсё так добра, як павінна быць на сапраўды цывілізаваным рынку. Нават па такім кошце аднапакаёвага жылля не хапае або па сваіх характарыстыках яно не адпавядае прапанаванаму цэнніку. Хапае ў агенцтвах аднапакаёвых кватэр па 400—500 долараў. Адразу заўважу, што гэта не заўсёды сапраўды шыкоўныя апартаменты. Так, там сучасная мэбля, добры рамонт — і на гэтым усё. Там няма нейкай сваёй разыначкі ці своеасаблівага дызайну. Гэта якасныя, але звычайныя кватэры, на якіх гаспадары вырашылі зараз зарабіць добрыя грошы. Часам іх здымаюць на месяц ці два, пакуль не адшукаюць нешта таннейшае. Бывае, такое жыллё «вісіць» на рынку некалькі месяцаў, а потым таннее.

Увогуле, на думку спадарыні Лукашэвіч, на рынку зараз назіраецца такая сітуацыя, калі сярэднестатыстычны кватарант не мае магчымасць здымаць жыллё так дорага, але вымушаны гэта рабіць. Існуючае сутыкненне інтарэсаў паміж уласнікам жылля і кватарантам надае адносінам паміж імі не самую лепшую афарбоўку. Прагных гаспадароў кліенты, мякка кажучы, недалюбліваюць...

Мінімальны кошт двухпакаёвых кватэр у маі павялічыўся да 400 долараў плюс аплата камунальных паслуг. Каб знайсці добрую кватэру па такім кошце, трэба пачакаць або спадзявацца, што вам пашанцуе.

Значна больш варыянтаў па стандартных двухпакаёвых кватэрах прыпадае на жыллёвыя памяшканні па кошце ад 420 да 450 долараў. Аднак і па такім цэнніку сапраўды якаснага жылля ўжо не хапае. Напрыклад, у новабудоўлях прасторныя двухпакаёўкі з сучаснай кухняй, пральнай машынай і часткова з мэбляй прапануюцца ўжо за 500 долараў. Сапраўды якасныя двухпакаёвыя кватэры з усёй неабходнай бытавой тэхнікай і сучаснай мэбляй, часам з рамонтам па дызайн-праекце, каштуюць ужо ад 500 да 600 долараў. Стабільны попыт існуе і на такое дарагое, але высокаліквіднае і камфортнае жыллё.

**Галоўны цэннік па аднапакаёвых кватэрах цяпер дасягнуў 320—350 долараў. Разам з тым па гэтым сегменце не ўсё так добра, як павінна быць на сапраўды цывілізаваным рынку. Нават па такім кошце аднапакаёвага жылля не хапае або па сваіх характарыстыках яно не адпавядае прапанаванаму цэнніку.**

Мінімальны цэннік на бюджэтныя трохпакаёвыя кватэры складае каля 400—450 долараў. Шматпакаёўкі крыху лепшай якасці каштуюць ужо на 100 долараў больш. Калі дадаць яшчэ 100 долараў, то можна адшукаць трохпакаёўку з усімі «наваротамі».

### СЕЗОННЫЯ КВАТЭРЫ ЗДАЮЦЦА «БАБУЛЯМІ» САМАСТОЙНА

У мінулыя гады такое жыллё, якое здавалася кліентам менавіта на дачны сезон, сапраўды крыху «збівала» кошты на рынку арэнды Мінска. Зараз патрабаванні да якасці здымнага жылля ўжо зусім іншыя. Маладыя сем'і не жадаюць жыць у кватэрах з вылінялымі шпалерамі, дзе шмат старой мэблі і розных іншых чужых рэчаў, дзе стаіць не зусім прыемны пах старых людзей і свойскіх жывёл. Аднак галоўнае тут тое, што падобнае жыллё амаль ніколі не здаецца праз агенцтвы.

Спецыялісты агенцтваў адказваюць за якасць сваіх паслуг, таму і тлумачаць сваім кліентам, што гэта жыллё здаецца толькі на летні сезон. А ў такім выпадку здаць сваю кватэру па рынкавым кошце пенсіянерам будзе ўжо праблематычна.

Таму сёння «суперразумныя» дачнікі здаюць сваё жыллё праз інтэрнэт выключна іншагароднім кліентам без афіцыйнага афармлення дагавораў. А вось восенню такіх кватарантаў можна лёгка і папрасіць з хаты... Дзіўна, але факт, што нават такое часовае жыллё здаецца «бабулямі» па максімальным рынкавым кошце.

### НОВЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА КВАТАРАНТАЎ

Сёлета гаспадары здымных кватэр сталі больш патрабавальна выбіраць сабе будучых кватарантаў. Зараз каля 90 працэнтаў кватэраздатчыкаў хочуць мець у якасці кватарантаў маладую сям'ю без малых дзетак (ці ўвогуле без дзяцей) і без жывёл. У маладых людзей могуць запатрабаваць пашпарт, каб даведацца, што іх шлюб зарэгістраваны.

А вось грамадзянства, нацыянальнасць і рэгістрацыя ў сталіцы ролі амаль не адыгрываюць. Апошнім часам з'явілася новая тэндэнцыя, калі ўласнікі жылля патрабуюць дакладную інфармацыю аб месцы пастаяннай працы кватарантаў, якую потым могуць праверыць, а таксама яшчэ і даведку аб сярэдніх заробках сваіх будучых жыльцоў.

### ДЭФІЦЫТ БУДЗЕ ПАВЯЛІЧВАЦЦА І НАДАЛЕЙ

Аксана Лукашэвіч упэўнена, што ў бліжэйшыя 1—2 месяцы дэфіцыт бюджэтных кватэр будзе ўзмацняцца, а цэннік на іх працягне расці. Справа ў тым, што колькасць свабодных кватэр у Мінску не павялічваецца, бо ў сталіцы скараціліся аб'ёмы будаўніцтва жылля для чаргавікоў.

Другім фактарам ціску на арэндны рынак стала новая хваля кватарантаў з бліжэйшых населеных пунктаў Мінска, якія знайшлі ў сталіцы грашовую працу. Зараз у галоўным мегаполісе краіны пачало дзейнічаць шмат замежных гандлёвых цэнтраў і іншых структур, якія не толькі плацяць добрыя заробкі сваім работнікам, але і аплачваюць ім, часткова ці цалкам, здымнае жыллё.

У гэтым выпадку хутка можа адбыцца перасяленне маладых сем'яў мінчан зноў да сваіх бацькоў. Потым, прыкладна ў жніўні—верасні, некалькі дзясяткаў тысяч студэнтаў атрымаюць дыпломы. Частка з іх пажадае застацца ў Мінску. На гэты ж час прыпадае ў сталіцы максімальны студэнцкі бум, калі тут з'явіцца чарговая хваля першакурснікаў. Калі падобныя прагнозы хаця б толькі часткова пачнуць спраўджвацца, то ў Мінску са здымным жыллём стане сапраўды цяжка. Тады і цэны на месцы стаяць не будуць.

**Сяргей КУРКАЧ** ■

# ГАРАЧЫХ ТУРАЎ СТАЛА МЕНШ

**У гэтым турыстычным сезоне скарацілася колькасць прапаноў гарачых пуцёвак ад беларускіх тураператараў, паведаміла дырэктар аднаго са сталічных турагенцтваў Гелена Гаўрылава.**

Асноўная прычына ў тым, што па многіх кірунках, такіх як Грэцыя, Балгарыя, туры на чэрвень былі забраніраваны яшчэ ў студзені. Таму што грэчаскія і балгарскія партнёры даволі рана прапанавалі цэны на сёлетні сезон з вельмі добрымі зніжкамі і бонусамі.

— За 10-гадовую практыку працы ў турыстычнай сферы я ўпершыню сустракаюся з сітуацыяй, калі колькасць замоўленых тураў па раннім браніраванні будзе пераважаць над колькасцю набытых па гарачых пуцёўках, — гаворыць Гелена.

У першую чаргу з адсутнасцю гарачых прапаноў сутыкнуліся турысты, якія жадаюць выехаць менавіта ў краіны з абавязковым візавым афармленнем. Значна больш прапаноў на адпачынак у дзяржавы, дзе візы можна зрабіць па прылёце ў аэрапорт альбо наогул не патрабуюць падобнага афармлення — напрыклад, у Турцыю, Егіпет, Чарнагорыю.

Як адзначыла спецыяліст іншага сталічнага турагенцтва, прычына сціплай прапановы гарачых тураў тоіцца і ў невялікай колькасці чартарных рэйсаў з Мінска ў параўнанні з Масквой або Кіевам.

Акрамя таго, многія сталічныя турагенты адзначаюць, што сутыкаюцца з праблемамі пры запісе на афармленне віз у пасольства Балгарыі і для атрымання грэчаскіх віз у пасольстве Літвы (яно ўпаўнаважана праводзіць падобную працэдуру).

— Нам прапануюць ехаць і атрымліваць візы ў пасольстве Грэцыі ў Маскве, — гаворыць турагент. — Але гэта вядзе да падаражання візы і павелічэння тэрміну яе атрымання з 5 да 16-17 дзён.

Варта адзначыць, што сярод сталічных вандроўнікаў па-ранейшаму папулярны элітны адпачынак на Мальдыўскіх астравах, Кубе, у Дамініканскай Рэспубліцы, Маўрыкіі. Павышаным попытам сёння карыстаюцца туры на Маёрку (Іспанія) і Сіцылію, Апулію (Італія).

*«Мінск—Навіны».*

## ГАЗ У КАЛЕДЖЫ

У Мінскі гарадскі цэнтр МНС паведамілі пра распыленне газу ў каледжы па вуліцы Прытыцкага. Падчас разбору было высветлена, што на першым паверсе ў памяшканні мужчынскага санвузла невядомай асобай было распылена нейкае рэчыва (мяркуецца, што пярцовы газ). У выніку атручэнні газам атрымалі чацвёра навучэнцаў 16-18 гадоў. Пасля аказання дапамогі ў бальніцы іх адпусцілі дадому.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА.

### НОВЫ АЎТАРСКІ



Падведзены вынікі спаборніцтваў сярод звяздоўскіх рашальнікаў шашачных пазіцый. У іх перамаглі Аляксандра Камінская (Вілейка), Уладзімір Валчкоў (Маладзечна), Уладзімір Бандарык (В. Лугавая Слабада Мінскага раёна), Аляксандр Белы (Наваполацк) і Аляксандр Перавознікаў з Рагачова (аўтарскі-15), а таксама Сяргей Нячаеў (Баранавічы), Віктар Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), Ігар Ананіч (Гродна), Уладзімір Сапяжынскі (Рагачоў) і мінчанін Альберт Літвінаў (конкурсы 13 і 16). Кожнага лаўрэата чакае сюрпрыз з фонду, створанага чэмпіёнам свету Пятром Шклудавым з Наваполацка (**на фота**). Ён даслаў заданні для свайго новага аўтарскага конкурсу-17. З задавальненнем падаем першыя з іх:



№ 1. **Белыя**: a3, a5, c1, d6, e7, f6, g7 (7). **Чорныя**: b4, b8, c3, c5, d4, e3, h2, h8 (8).



№ 2. **Белыя**: a3, c7, d6, e1, e7, f2, g1, h6 (8). **Чорныя**: b4, b8, c3, c5, d2, d4, e3, f8, h2, h8 (10).

№ 3. **Белыя**: a5, d6, e5, e7, f2, f6, g1 (7). **Чорныя**: a7, b2, b4, c3, d4, e3, h6 (7).

Ва ўсіх іх пашукайце пераможныя камбінацыі.

Усяго падрыхтавана 24 заданні. Кожнае ацэньваецца ў адно ачко. Будуць адзначаны шэсць прызёраў. Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас:

**220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

### З РАШАЛЬНІКА Ў СКЛАДАЛЬНІКІ

Рашальнік пазіцый Уладзімір Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна) стаў і сам іх складаць. Паглядзіце адну з яго спроб:

**Белыя**: b2, c1, c5, d4, e1, e3, h6 (7). **Чорныя**: a5, a7, c7, f8, g7, h2 (6). Змест: b6, d8 (g1) h4, e7, b4, b2 (d2) e:c3x. На жаль, дапускаецца дуаль 3. g5/h4x. Яна мае месца і ў другой дасланай пазіцыі — 7. c5/a3x. А ў трэцяй нічога новага няма. Гэтыя заўвагі пачаткоўцам карысна ўзяць на заметку.

### РАШЭННІ

**«Памяці Гімбутаса»**(А. Палявы, М. Грушэўскі): **№ 1** — 19, 14, 2, 29, 16 (30) 43 (35) 49 (11) 44 (16) 49 (21, 40) 11 (45) 50#.

**«Пагода ў доме»** (М. Грушэўскі): **№ 9/13** — ab4, b4, de3, f4 (e1) f2, e1x, па-за конкурсам **№ 23** — e7, a7, ab4 (f4) g5, b4 (g3) f6, bc5, h4x і **№ 24** — g5, b8, d2, d8, c1, g3!, f8x.

■ «Ліпа»

# «КРЭДЫТ»... ДЛЯ ВЫКАНАННЯ ПАКАЗЧЫКАЎ

**Службовыя асобы Лельчыцкага райпа па паперах набывалі ў крэдыт тавары на сумы, якія ў 4 разы перавышаюць іх сярэднямесячны заробак. Акрамя таго, з цэха паўфабрыкатаў гэтай арганізацыі ва ўстановы адукацыі раёна для дзіцячага харчавання сістэматычна адпускаліся пратэрмінаваныя паўфабрыкаты.**

У Камітэце дзяржкантролю Гомельскай вобласці расказалі, што на нездавальняючую працу Лельчыцкага раённага спажывецкага таварыства неаднаразова скардзіліся грамадзяне. Калі ж была праведзена праверка, высветлілася, што, каб выканаць даведзеныя паказчыкі па тавараздвароце, кіраўніцтва райпа не турбавала сябе павышэннем якасці гандлёвага абслугоўвання. Для пакрыцця неабходных аб'ёмаў у рахунак заработнай платы супрацоўнікам на паперы выдаваліся... таварныя крэдыты. У асобныя перыяды ўдзельная вага «крэдытных тавараў» у агульным аб'ёме тавараабароту харчовых крам складала да 50 %, а прамысловых — да 81 %. Дайшло да абсурду: некаторымі працаўнікамі штомесяц у «крэдыт» набываліся тавары на сумы, якія ў 4 разы перавышаюць іх сярэднямесячны заробак. Напрыклад, на момант праверкі запазычанасць па крэдытах за два гады намесніка старшыні райпа па эканоміцы, галоўнага бухгалтара, склала больш за Br33 млн. Акрамя таго, у фіктыўны крэдыт афармляліся тавары, якія фактычна адсутнічалі ў гандлёвай сетцы. Так за 2012 год па 6 правераных крамах сума «крэдытаў», быццам выдадзеных адсутнымі таварамі, склала больш за Br96 млн. Напрыклад, у краме вёскі Буйнавічы за 7 месяцаў 2012 года сума аформленых у «крэдыт» тавараў перавысіла іх фактычнае паступленне больш чым на Br57,4 млн.

Таксама падчас праверкі супрацоўнікамі Камітэта дзяржкантролю ўстаноўлены факты сістэматычнай выдачы з цэха паўфабрыкатаў райпа ва ўстановы адукацыі Лельчыцкага раёна для арганізацыі харчавання дзяцей у школах і дашкольных установах пратэрмінаваных (да 5 сутак) паўфабрыкатаў. Са студзеня па кастрычнік мінулага года 4,5 тоны пратэрмінаваных мясных паўфабрыкатаў і катлетнага мяса было накіравана для харчавання дзяцей. Па выніках праверкі Камітэтам дзяржкантролю Гомельскай вобласці да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 16 службовых асоб і Лельчыцкае райпа.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ДЗЯРЖАЎНАЯ ЛЯСНАЯ АХОВА ПЕРАЙШЛА НА ЎЗМОЦНЕНЫ РЭЖЫМ ПРАЦЫ

**Дзякуючы зацяжной зіме і моцным ападкам сёлета першы лясны пажар быў зафіксаваны нашмат пазней, чым у папярэднія гады — 23 красавіка ў Мілашэвіцкім лясніцтве (гэта адбылося летась 17 сакавіка, калі першае загаранне было зафіксавана ў лясным фондзе Брэсцкага лясгаса).**

З устанаўленнем цяпла ў маі пажарная небяспека ў лясах павялічылася. Найперш сказваецца выпальванне сухой расліннасці на землях, якія прымыкаюць да ляснога фонду. У веснавы перыяд менавіта сельгаспалы становяцца асноўнай прычынай лясных пажараў. Акрамя таго, узрастае небяспека ўзгаранняў лясных насаджэнняў у сувязі з актыўным наведваннем лясоў насельніцтвам і парушэннем ім правілаў пажарнай бяспекі. Найбольшая колькасць пажараў адбылася на мінулым тыдні якраз па гэтай прычыне, калі грамадзяне масава выязджалі на свае дачныя ўчасткі, палілі сухую расліннасць, смецце ці проста адпачывалі на прыродзе.

Зараз найбольш высокая пажарная небяспека ў лясах (чацвёртага класа; самы высокі — пяты) назіраецца па ўсходняй палове краіны, месцамі па ўсходніх раёнах адзначаецца трэці клас. Па заходняй палове краіны назіраецца пажарная небяспека першага класа, у асобных раёнах — 3-4-га. Зараз дзяржаўная лясная ахова працуе ва ўзмоцненым рэжыме. Міністэрства лясной гаспадаркі нагадвае грамадзянам аб неабходнасці захавання правілаў пажарнай бяспекі ў лясах і адказнасці за іх парушэнне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Крымінал, здарэнні

## КВАТЭРНАЕ ПЫТАННЕ САПСАВАЛА КІРАЎНІКОЎ

**Следчым упраўленнем СК па Гомельскай вобласці прыняты да вытворчасці крымінальныя справы, заведзеныя пракуратурай Гомельскай вобласці ў дачыненні да дырэктара камерцыйнай структуры Гомеля і службовай асобы, якая выконвала абавязкі начальніка аддзела па кіраванні будаўнічым комплексам і жыллёвай палітыцы Гомельскага гарвыканкама.**

Камерцыйнай структурай па коштах, значна ніжэйшых за рынкавыя, былі незаконна набыты тры кватэры, — расказала афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта Беларусі па Гомельскай вобласці Марыя Крываногава. — Жыллё прызначалася для адсялення грамадзян, чые дамы падлягалі зносу. У далейшым гэтыя кватэры былі рэалізаваны па рынкавым кошце трэцім асобам. Неправамернае заключэнне здзелак па рэалізацыі кватэр пацягнула прычыненне шкоды дзяржаве на суму больш за 1 мільярд рублёў. Дзеянні дырэктара камерцыйнай структуры кваліфікаваны следствам як злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі, якое пацягнула цяжкія наступствы, дзеянні службовай асобы — як службовая халатнасць.

## БРАТ НА БРАТА

**Абвінавачванне ў забойстве двух чалавек, здзейсненым з асаблівай жорсткасцю, прад'яўлена жыхару пасёлка Савет Буда-Кашалёўскага раёна адпаведным аддзелам Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь.**

Падчас сваркі вечарам 14 мая абвінавачваны пасек свайго роднага брата і яго сужыцельку сякерай. Ад атрыманых ран мужчына і жанчына памерлі на месцы здарэння. Ва ўпраўленні Следчага камітэта Беларусі па Гомельскай вобласці расказалі, што, па асноўнай версіі, матывам здзяйснення злачынства сталі асабістыя непрыязныя адносіны жыхароў аднаго дома. Дарэчы, канфлікты на гэтай агульнай жылой тэрыторыі сталі амаль звычайнай справай. Як стала вядома, у 2011 годзе злачынца прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за наўмыснае прычыненне сужыцельцы брата лёгкага пашкоджання. Цяпер забойца пад вартай, праводзяцца неабходныя следчыя дзеянні.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ВЫМАГАЎ ГРОШЫ Ў ШКОЛЬНІКА

**Супрацоўнікі інспекцыі па справах непаўналетніх Маскоўскага РУУС сталіцы затрымалі 19-гадовага непрацуючага мінчаніна, які вымагаў грошы ў дзесяцікласніка.**

Група падлеткаў «тусіла» ў кавярні ў цэнтры горада. Адзін з хлопцаў пайшоў у прыбіральню, дзе да яго падышоў незнаёмец і завёў размову кшталту «Ты мяне паважаеш?». Потым пачаў пагражаць падлетку і нават ударыў таго. Вярнуўшыся да століка, школьнік расказаў пра здарэнне сябрам. Гэта пачуў ахоўнік установы і выклікаў міліцыю. У выніку хулігана затрымалі і прыцягнулі да адміністрацыйнага арышту. Адбыўшы пакаранне, грамадзянін знайшоў у інтэрнэце хлопца і накіраваў яму паведамленне, маўляў, хачу сустрэцца, папрасіць прабачэння. Аднак пры сустрэчы хуліган сказаў падлетку, што яму давялося заплаціць штраф. І грошы трэба вярнуць, пакрыўшы яшчэ і маральны ўрон. У суме «атрымалася» 1,2 мільёна рублёў. Аднак, нягледзячы на пагрозы, школьнік адмовіў вымагальніку.

Гісторыя атрымала працяг праз некалькі дзён каля той жа кавярні, куды зноў прыйшоў падлетак. Выходзячы са спадарожніцай з установы, ён сутыкнуўся са сваім крыўдзіцелем. Той на гэты раз размаўляць не стаў, а адразу некалькі разоў ударыў школьніка. Падлетак вырваўся і забег у бліжэйшую краму. А калі выйшаў з яе, зноў сутыкнуўся з агрэсіўным грамадзянінам. На гэты раз удары пасыпаліся градам. Спадарожніца хлопца закрычала, прыцягваючы ўвагу мінакоў. Прыбыўшыя міліцыянеры затрымалі падазраванага ў вымагальніцтве. Зараз яму пагражае не адміністрацыйная адказнасць, а пазбаўленне волі.

## БРАКАНЬЕРСКІ «СЯМЕЙНЫ ПАДРАД»

**Начальнік Бярозаўскай міжрайінспекцыі разам з супрацоўнікамі 4-га ўпраўлення па Брэсцкай вобласці галоўнага ўпраўлення ўласнай бяспекі МУС пры правядзенні аператыўных мерапрыемстваў на вадасховішчы Сялец затрымалі дваіх маладых людзей і іх бацьку. У перыяд абмежавання на вылаў усіх відаў рыб грамадзяне вялі яе незаконную здабычу забароненымі прыладамі лоўлі.**

— У парушальнікаў канфіскавана 30 сетак агульнай даўжынёй 1 500 метраў і надзіманая лодка, а таксама 536 асобін розных відаў рыб агульнай вагой 221 кілаграм (!). Бярозаўскі РАУС завёў крымінальную справу за незаконную здабычу рыбы, якая пацягнула нанясенне шкоды ў асабліва буйным памеры, — распавяла «Звяздзе» прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — А гэта ні многа, ні мала — 171,9 мільёна рублёў (1 719 базавых велічынь).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## МЫТНЯ НЕ ДАЛА «ДАБРО»

**На пункце пропуску «Варшаўскі мост» супрацоўнікі мытні ў ходзе агляду рэйсавага аўтобуса, які ішоў з Германіі ў Расію, знайшлі пакет з рознымі лекамі. Сярод іх былі прэпараты з псіхатропным рэчывам «трамадол».**

Апошняе абмежавана да перамяшчэння праз мытную мяжу Мытнага саюза. Медыкаменты канфіскаваны для правядзення экспертызы. Вадзіцель аўтобуса, грамадзянін Расіі, патлумачыў, што пакет яму перадалі ў Германіі для атрымальніка ў Маскве. Пра змесціва ён не ведаў. Праводзіцца праверка.

У гэты ж час на пераходзе «Дамачава» мытнікі знайшлі тэлефонную кантрабанду. Грамадзянін Беларусі, які вяртаўся з Польшчы, пісьмова заявіў, што вязе дзіцячы аўтамабіль коштам 200 долараў. А ў гэтай цаццы і знайшлі 12 смартфонаў, схаваных ад агляду. Як паведамілі ў прэс-групе Брэсцкай мытні, тавар на суму 84 мільёны рублёў і аўтамабіль канфіскаваны да рашэння суда.

**Яна СВЕТАВА.**

## ВА ЎСІМ ВІНАВАТА КАХАНАЯ?

**Качагар Нацыянальнага парку «Браслаўскія азёры» ўчыніў цяжкае злачынства з-за таго, што пасварыўся па мабільным тэлефоне з каханай.**

— У крыўдзе ён зайшоў у будынак кантрольна-прапускнога пункта парку, дзе знаходзілася супрацоўніца аховы. Спачатку папрасіў патэлефанаваць па гарадскім тэлефоне. А потым з нажом у руцэ патрабаваў ад жанчыны, каб яна знайшла яму скотч, каб ім яе ж і звязаць, — расказвае Васіль Якаўлеў, супрацоўнік аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці. — Спадзяваўся завалодаць грашыма з сейфа ў яе кабінеце, а таксама ключамі ад яе аўто «Пежо», які хацеў скрасці і прадаць. Але ад'ехаць далёка не змог, бо машына забуксавала, а тут і міліцыя прыехала, якую выклікала ахоўніца.

Качагару ўдалося тады ўцячы. Паспеў патраціць грошы, якія дастаў з сейфа: усяго 50 тысяч рублёў купюрамі па 500 рублёў. Набыў спіртное, якое выпіў разам са знаёмым. На наступны дзень зламысніка затрымалі. Ён асуджаны на пазбаўленне волі тэрмінам на 3 гады і 6 месяцаў. Адбываць пакаранне будзе ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

## СКОКНУЎ ХЛОПЧЫК З ДАМБЫ

**Што падштурхнула вучня 9 класа на такі «подзвіг», сказаць ужо складана. Цела хлопчыка знайшоў вадалаз.**

Як удакладнілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях, трагедыя адбылася ў Лепельскім раёне. Раніцай школьнік скокнуў з дамбы Лепельскай ГЭС у раку Ула і не ўсплыў. 1,5 гадзіны спатрэбілася работніку Лепельскага таварыства выратавання на водах, каб знайсці цела падлетка. Яно знаходзілася на глыбіні 2 метры, ніжэй па цячэнні ракі, на адлегласці прыкладна 20 метраў ад дамбы. Медыкам «хуткай дапамогі» заставалася толькі канстатаваць смерць школьніка.

## ІНТЭРНАТ ГАРЭЎ З-ЗА ЭЛЕКТРАПЛІТЫ

**У Бешанковічах жанчына загінула падчас пажару ў інтэрнаце.**

— Пажар адбыўся а чацвёртай гадзіне ночы, на вуліцы Пушкіна ў 1-пакаёвай кватэры на верхнім паверсе 2-павярховага інтэрната, які належыць дачынаму камунальнаму ўнітарнаму прадпрыемству «Бешанковіцкая ПМК-41», — паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. — На падлозе было знойдзена цела жыліцы 1964 года нараджэння. Яна не працавала, са слоў суседзяў, злоўжывала спіртнымі напоямі, знаходзілася на ўліку ў нарколага. З суседніх кватэр 2-га паверха эвакуявалі 5 чалавек, пацярпелых няма. Мяркуецца, прычына пажару — парушэнне правілаў эксплуатацыі электрасетак і электраабсталявання: кароткае замыканне ў электрапліце.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПРАТАРАНІЎ І ЗНІК

**Жыхар Мінска пратараніў машыну гамяльчаніна і кінуў яго паміраць у палаючым аўто.**

Як расказалі ў прэс-службе ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама, на выездзе з горада «Опель» прыпыніўся для павароту ў жылы мікрараён налева, калі яго пратараніла ззаду «Аўдзі». Удар быў такой сілы, што машыну выкінула на ўзбочыну і фактычна разарвала на часткі. Па словах відавочцаў, «Опель» адразу ўспыхнуў ад пашкоджанага бензабака. Выбрацца з машыны, ахопленай полымем, 39-гадовы мужчына не змог. Яго цела выратавальнікі змаглі выняць толькі пасля таго, як патушылі аўтамабіль.

Віноўнік аварыі з месца ДТЗ знік. Ён выехаў за горад у лес і там кінуў сваю «Аўдзі». Мужчына паспрабаваў выклікаць таксі, але яго на працягу гадзіны затрымалі інспектары ДПС на дарозе Гомель — Хутар. Цяпер 35-гадоваму грамадзяніну пагражае да пяці гадоў пазбаўлення волі. Хутчэй за ўсё, мужчына за рулём «Аўдзі» на момант аварыі быў п'яны — ад медыцынскага агляду ён адмовіўся.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ** ■

# ПРАВА — МАЮЦЬ!

## Крапавыя берэты надзелі яшчэ 22 вайскоўцы



**Ва ўнутраных войсках МУС Беларусі традыцыйна прайшлі кваліфікацыйныя выпрабаванні на права нашэння крапавага берэта. Сёлета «крапавае братэрства» адзначае свой 20-гадовы юбілей.**

Нягледзячы на вялікую колькасць ахвотных, гэтым разам у барацьбу за крапавы берэт уступілі 89 прэтэндэнтаў (было пададзена 160 заяў), якіх дапусцілі да першага этапу спаборніцтваў. Пасля гэтага хлопцы праходзілі падрыхтоўку на працягу месяца.

Традыцыйна выпрабаванні прайшлі ў чатыры этапы: праверка агульнафізічнай падрыхтаванасці вайскоўца (уключае абавязковыя нарматывы), прыёмы самастрахоўкі, элементы акрабатыкі, прыёмы рукапашнага бою. На першым этапе адсеялася дваццаць два чалавекі. У навучальным цэнтры Дэпартамента аховы МУС «Гарані» стартаваў другі і трэці этапы — камбінаваны 10-кіламетровы марш-кідок з агнём, дымам, імітацыйнымі сродкамі, а таксама выкананне агнявых задач па знішчэнні праціўніка з розных відаў стралковай зброі вытрымалі не ўсе.

На заключным, чацвёртым этапе, што прайшоў на базе вайсковай часці № 3214, прайшлі вучэбныя баі. Запаветны крапавы берэт — сімвал мужнасці ваеннаслужачых унутраных войскаў — з рук намесніка міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь — камандуючага ўнутранымі войскамі палкоўніка Юрыя Караева атрымалі дваццаць два чалавекі.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**



**Выпрабаванні праходзяць з 1993 года. Сёння ў Беларусі больш за 700 уладальнікаў крапавах берэтаў.**





■ Жывая зямля

# ДРУГОЕ НАРАДЖЭННЕ БАРЦЕНІХІ

**На балоце Барценіха ў Валожынскім раёне адбылася прыродаахоўная акцыя. Мэта — падтрыманне папуляцый рэдкіх і знікаючых відаў птушак, у прыватнасці, шэрага жураўля.**

Яе арганізатарамі выступілі супрацоўнікі шэрагу міністэрстваў, а таксама прадстаўнікі міжнароднага праекта «Біяразнастайнасць», фінасавыя магчымасці якога скіраваны на садзейнічанне рацыянальнаму выкарыстанню водна-балотных рэсурсаў краіны. І вось сапраўдны дэсант мінчан высадзіўся ў лясным масіве непадалёку ад вёскі Вішнева, вядомай тым, што тут некалі нарадзіўся прэзідэнт Ізраіля Шымон Перэс. Гасцей чакалі. Старшыня Валожынскага райсавета Марына Іода падкрэсліла значнасць і важнасць рэалізацыі праекта па захаванні біяразнастайнасці ў раёне, тых жа рэдкіх птушак, жывёл і раслін у месцах былых распрацовак тарфянікаў. І на гэтым размовы скончыліся. Удзельнікі акцыі рушылі да месца работ па вяртанні былога выгляду і зместу Барценіхі.

Ландшафт — велічыня непастаянная. Пад уздзеяннем чалавека навакольнае асяроддзе часам непазнавальна мяняецца. Тыя, хто не наведваў Барценіху гадоў 10, дакладней, яе асушаныя і выпрацаваныя рэшткі, сёння думаюць, што заблудзіліся і не туды завіталі. Бо на ранейшы шэра-чорны ландшафт нельга было глядзець без болю, хацелася хутчэй пакінуць гэту нежывую пустэчу. Цяпер жа вока радуе зялёны пейзаж.

Гісторыя Барценіхі ў многім падобная на лёс многіх іншых беларускіх балот. На працягу многіх дзясяткаў гадоў цэнтральная частка балота была кардынальна пазбаўлена вільгаці. Торфаздабытчыкі ўсю больш-менш прыдатную сыравіну вывезлі адсюль, пакінулі пасля сябе велізарную чорную пляму плошчай больш за 190 гектараў. Нібы ад цяжкай незагойнай раны Барценіха пакутавала аж да 2007 года. Праўда, амаль адразу пасля завяршэння торфараспрацовак гэту знявечаную тэрыторыю, як заведзена, перадалі ў карыстанне Валожынскага лясгаса. Але такое ведамаснае перападпарадкаванне балоту мала чым дапамагло. Для пасадак лясных культур яго глеба не падыходзіла з-за экстрэмальных умоў: вясной яна была вельмі вільготнай, а летам тут назіраўся моцны дэфіцыт вільгаці, панавала засуха. Маладыя дрэвы ў такіх умовах не прыжываліся. Тым часам працягвалася дэградацыя выпрацаванага балота, якое забруджвала атмасферу выкідамі дзясяткаў тон вуглякіслага газу. У спякотныя месяцы тут у любы момант мог распачацца пажар.



Барценіха ў нашы дні пасля паўторнага забалочвання.

Масавыя ўзгаранні амаль усіх былых тарфянікаў (асабліва ў 2002 годзе, калі на асобных участках адразу гарэла аж да 3 тысяч гектараў) нярэдка суправаджаліся выбухамі снарадаў і боепрыпасаў, якія трапілі ў нетры балот яшчэ ў часы вайны. Пакуты насельніцтва ад шматдзённага задымлення навакольных вёсак і райцэнтраў падштурхнулі ўлады і грамадскасць да радыкальнага вырашэння праблемы шляхам паўторнага забалочвання. Барценіху адраджаць пачалі 5 гадоў таму. З таго моманту заолагі і батанікі рэгулярна маніторацць сітуацыю на балоце.

**Галоўны эксперт праекта «Біяразнастайнасць» Міхаіл МАКСІМЕНКАЎ** кажа, што вельмі цікава сачыць за тым, як вяртаецца жыццё ў Барценіху. За даволі кароткі перыяд тут на месцы торфараспрацовак сфармавалася суцэльная супольнасць водна-балотных відаў птушак, многія з якіх занесены ў Чырвоную кнігу. Спачатку навукоўцы зафіксавалі 17 відаў птушак, потым — 30, цяпер ужо больш за 40. Безумоўна, цар-птушкай супольнасці з'яўляецца шэры журавель — «чырванакніжнік» з 1981 года. Птушка настолькі рэдкая і паважаная, што вакол яе гнездавання забаронена ўсялякая гаспадарчая дзейнасць з 15 красавіка па 15 ліпеня, выпас свойскай жывёлы, выкарыстанне сродкаў аховы раслін, паляванне і г.д.

Паводле слоў дырэктара Валожынскага лясгаса Уладзіміра Грыневіча, значна ўзбагаціўся жывёльны свет вакол Барценіхі. Дзікі, бабры, ласі, алені ўсё актыўней абжываюць балотныя берагі. З'явілася рыба. Мясцовыя жыхары ловяць шчупакоў, карасёў, лінёў. Як трапна сказаў **Аляксандр КАЗУЛІН, вядучы навуковы супрацоўнік НПЦ Нацыянальнай акадэміі навук па біярэсурсах,** пустыня паступова ператвараецца ў аазіс. Такім чынам, адной чорнай плямай на целе Беларусі стала менш.

Тут трэба ўдакладніць, што балота Барценіха пачало аднаўляцца яшчэ ў час рэалізацыі ў краіне сумеснага з міжнароднымі арганізацыямі праекта «Тарфянікі-1». Менавіта тады была ўзведзена невялікая дамба, якая дазволіла частку вады акумуляваць для паўторнага забалочвання Барценіхі. Удала былі праведзены работы на выпрацаваных тарфяніках і ў іншых рэгіёнах. Гэтая акалічнасць стала падставай для новага, больш маштабнага праекта Праграмы развіцця ААН і Глабальнага экалагічнага фонду «Тарфянікі-2». Яго **менеджар Аляксей АРЦЮШЭЎСКІ** расказаў аб галоўных мэтах, задачах і чаканых выніках. У прыватнасці, мяркуецца выпрацаваць агульную палітыку і стратэгію па рацыянальным кіраванні тарфянымі рэсурсамі ў краіне да 2030 года, асаблівую ўвагу звярнуць на тарфянікі, якія неэфектыўна выкарыстоўваюцца ў якасці сельскагаспадарчых угоддзяў. Такі дакумент распрацоўваецца ўпершыню ў краіне. Бо дагэтуль кожнае міністэрства ці ведамства займалася гэтай работай у межах сваёй кампетэнцыі, што нярэдка прыводзіла да неразбярыхі, дублявання і марнавання сродкаў, часта ўзнікалі супярэчнасці паміж эканамічнымі інтарэсамі і экалагічнымі патрабаваннямі да адраджэння балот.

### Адной чорнай плямай на целе Беларусі стала менш.

Але гэты аднаўленчы працэс, каб ён не збочыў ад зададзенага кірунку, патрабуе пастаяннай прысутнасці і дапамогі чалавека. Вось і сёння ўдзельнікі акцыі, а гэта прадстаўнікі Мінпрыроды, Мінлясгаса, НАН Беларусі, мясцовай улады, жыхары раёна, у тым ліку школьнікі, сабраліся на ўскрайку Барценіхі, каб дапамагчы ёй хутчэй вярнуцца ў спрадвечны стан. Тут пасадзілі сотні саджанцаў чорнай алешыны і сасны.



Барценіха пасля асушэння.

Апошняе спачатку здалося дарэмнай справай, маўляў, і так балота зарасце. Аднак **Аркадзь СКУРАТОВІЧ, старшы навуковы супрацоўнік інстытута эксперыментальнай батанікі,** патлумачыў гэтыя пасадкі неабходнасцю падтрымліваць і распаўсюджваць менавіта беларускую раслінную біяразнастайнасць. Бо існуе пагроза захопу пакуль свабодных балотных плошчаў ад нашых кустоў і дрэў так званымі інавазіўнымі раслінамі. Напрыклад, амерыканскай іргой, сумнавядомым баршчэўнікам, якія ва ўмовах спрыяльнага клімату Беларусі з-за адсутнасці натуральных ворагаў даволі хутка растуць, паступова выцясняюць нашы расліны.

А перад ад'ездам удзельнікі прыродаахоўнай акцыі зрабілі яшчэ адну добрую справу: усталявалі інфармацыйны стэнд «Балота Барценіха — месца гнездавання шэрага жураўля», каб людзі ведалі, што за птушка тут пасялілася пару гадоў таму і чаму трэба яе ахоўваць.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**
*Валожынскі раён.*

# РАЗАМ ПАДАЛІ РУКУ ДАПАМОГІ

**Найбольш актыўная паводка сёлета была ў Гомельскай, Гродзенскай і Віцебскай абласцях, а таксама на Палессі. Там працавалі атрады хуткага рэагавання Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа.**

— На веснавую паводку, што адбылася ў некаторых рэгіёнах краіны сёлета, мы прыцягнулі каля 700 мільёнаў рублёў, якія нам прадаставіла Міжнародная Федэрацыя таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца, — паведаміла намеснік генеральнага сакратара Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Іна Лемяшэўская на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры. — Плюс наш рэзервовы фонд, які папаўняецца за кошт унёскаў членаў Чырвонага Крыжа, у памеры 100 мільёнаў рублёў, таксама быў накіраваны на аказанне дапамогі. У затопленых рэгіёнах больш за 3 тысячы чалавек, пацярпелых ад паводкі, атрымалі харчовыя і гігіенічныя наборы, 524 пацярпелым былі выдадзены коўдры, 264 чалавекам прадастаўлена псіхалагічная дапамога.

Акрамя гэтага, 51 сям'я атрымала дапамогу па адпампоўцы вады з затопленых дамоў. У межах акцыі былі праведзены пошукава-выратавальныя мерапрыемствы па пошуку васьмі чалавек.

Па словах галоўнага спецыяліста па падрыхтоўцы і рэагаванні на надзвычайныя сітуацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Дзмітрыя Русакова, рыхтавацца да паводкі сёлета пачалі загадзя. І такі падыход даў плён:

— У прыватнасці, скараціўся час рэагавання. Калі раней мы маглі выступіць у падтопленыя рэгіёны з Мінска за два-тры дні, то пасля прарыву дамбы каля вёскі Мардвін Петрыкаўскага раёна мы былі там ўкамплектаваныя ўжо праз шэсць гадзін.

Такое ўдасканаленне працы валанцёраў-выратавальнікаў у многім было б немагчымым без прыцягнення партнёраў. У прыватнасці, дапамогу ў правядзенні мерапрыемстваў аказвала «Кока-Кола Беўрыджыс Беларусь». Намеснік генеральнага дырэктара па прававых пытаннях і знешніх сувязях кампаніі Настасся Гарошка адзначыла:

— Бізнес і грамадскія арганізацыі могуць паспяхова адзін аднаго дапаўняць. Так, у нас развіты аўтапарк, а Чырвонаму Крыжу быў неабходны рамонт аўтамабіляў. Таксама і ў перыяд паводкі: людзям была неабходна чыстая пітная вада, якую выпускае наша прадпрыемства і якую мы прадаставілі.

Дарэчы, супрацоўніцтва «Кока-Кола» з Міжнароднай Федэрацыяй Чырвонага Крыжа доўжыцца ўжо амаль сто гадоў — з 1917 года. І ўжо больш за год прадпрыемства «Кока-Кола Беўрыджыс Беларусь» актыўна ўзаемадзейнічае з Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**




**У цэнтры Наваполацка сядзіць музыкант — жартоўная скульптура трубача. Сярод гарадскіх легенд ёсць некалькі тлумачэнняў таму, хто гэта і адкуль ён з'явіўся.**

*Ён адстаў ад аркестра. Крычы не крычы —*
*Не заўважылі страты сябры-трубачы.*
*Ён блукаў па палях, па чужых гарадах*
*Са старою, няўклюднай трубой у руках.*
*Ён іграў тыя маршы, што ўдалеч вялі,*
*Але людзі за ім у паход не ішлі,*
*Не прасілі на біс, не прыносілі руж,*
*Не кідалі дукаты ў яго капялюш.*
*Ён тады прыгадаў, як звіняць ручайкі,*
*Як шапоча аер каля ціхай ракі,*
*Серэнады салоўкі (званчэй не знайсці!) —*
*І зайграў тыя песні, што ёсць у жыцці!*
*Ён славутасцю стаў, як ты тут ні мяркуй.*
*Ён іграе на плошчы — прыходзь і пачуй.*

# «ПРАСПІДЭЛОНГ» І «ТЭМАДЭКС» — АЙЧЫННЫЯ СУПРАЦЬРАКАВЫЯ СРОДКІ

**На выстаўцы «Супрацьпухлінныя і дыягнастычныя прэпараты», якая пройдзе ў Ліцэі БДУ з 23 па 25 мая ў рамках беларуска-расійскай навукова-практычнай канферэнцыі «Айчынныя супрацьпухлінныя прэпараты», будуць прадстаўлены лекавыя сродкі «Праспідэлонг» і «Тэмадэкс». Як паведамілі ў прэс-службе БДУ, гэта гідрагелі для лакальнай хіміятэрапіі злаякасных новаўтварэнняў, якія разыходзяцца ў арганізме. «Праспідэлонг» і «Тэмадэкс» не маюць аналагаў па сваім саставе.**

Спосаб прымянення айчынных гідрагеляў хірургічны: яны імплантуюцца ў месца выдаленай пухліны і аказваюць супрацьпухліннае дзеянне непасрэдна ў пашкоджаным органе. Галоўнае, гэтыя прэпараты прадухіляюць метастазаванне, садзейнічаюць змяншэнню дозы цытастатыку і зніжаюць таксічную нагрузку на арганізм. У прыватнасці, «Праспідэлонг» прызначаны для лячэння хворых на рак страўніка з дысемінаваным пашкоджаннем брушной поласці. Медыка-біялагічныя даклінічныя выпрабаванні прэпарата паспяхова прайшлі на жывёлах. Падрыхтавана нарматыўна-тэхнічная дакументацыя для атрымання дазволу на правядзенне клінічных выпрабаванняў. Атрыманы патэнты ў Беларусі і Расіі. Даказана, што прымяненне прэпарата «Тэмадэкс» у камбінаванай хіміяпрамянёвай тэрапіі гліём галаўнога мозга (III-IV стадыі) павялічвае безрэцыдыўны перыяд і працягласць жыцця хворых.

Абодва прэпараты распрацаваны ва ўнітарным прадпрыемстве «Унітэхпрам БДУ», серыйна вырабляюцца на РУП «Белмедпрэпараты» і УП «Унітэхпрам БДУ».

*«Мінск—Навіны».*

■ Крытыка на шпільцы

# ЛІСТЫ ЧУЖОГА ЖЫЦЦЯ



**У сярэдзіне мінулага стагоддзя амерыканскі доктар-псіхіятр Томас С. Сас, аўтар кнігі «Фабрыка вар'яцтва» скрушна заўважыў: «Мы сістэматычна падманваем сябе, прымаючы частую перамену моды на казлоў адпушчэння за навуковы і маральны прагрэс».**

Самымі моднымі ізгоямі вясны, здаецца, сталі бабры. Не паспелі мы даведацца пра тое, што яны «загрызаюць насмерць рыбакоў», як з'явіўся новы віток бабрафобіі — цяпер яны палохаюць жанчын... І вось ужо чуваць заклікі змагацца з бабрамі, якіх, бач ты, чалавеку стала замнога.

Такі антрапацэнтрычны падыход да прыроды, у якім пануе не жаданне гармоніі, а выключна спажывецка-эгаістычныя памкненні, на жаль, сёння ўласцівы не толькі гараджанам, але і вясковым жыхарам. І здорава, што час ад часу знаходзяцца людзі, якія здольны збіць карону самазадаволенасці з чалавечых галоў, нагадваючы, што ўсе мы — перш-наперш «жывыя істоты», а ўжо пасля члены грамадства. Вельмі тактоўна здолеў напісаць пра гэта ў сваёй кнізе «Мой лістапад» Алесь Усеня.

Трэба прызнацца, што да яго кнігі ўспамінаў я спачатку паставілася з вялікім скепсісам. Па-першае, не вельмі люблю сённяшнія рэфлексіі-карацелькі, якія, здаецца, хутка канчаткова выціснуць з літаратуры буйныя аповесці і раманы. Па-другое, не асабліва ўразіла мяне тая прадмоўка, якую аўтар сам для кнігі і напісаў. Прадмова невялікая, але цалкам акрэслівае матывы, якія пасунулі А. Усеню напісаць нататкі пра ўласнае жыццё: «Па-першае, любы чалавек цікавы сам па сабе (нездарма кажуць: кожная асоба — гэта цэлы сусвет). Па-другое, у мяне ёсць дочкі, унучкі, будуць і праўнукі. Дык няхай хоць яны прачытаюць, што быў у іх такі продак, нешта рабіў, пра нешта думаў...»

Такое тлумачэнне, шчыра кажучы, зусім не заахвочвала да чытання — ну падумаеш, яшчэ адзін стары ўзяўся згадваць, як басанож па траве бегаў! Але першыя ж прачытаныя абразкі зачапілі такой спавядальнай, я нават сказала б — пакаяннай інтанацыяй, што захацелася чытаць далей, тым больш што кніга яркая і роўная, як восеньскі букет, сабраны з лістоў-успамінаў, якія, здаецца, гатовыя разляцецца ў любы момант, каб не воля аўтара, які звязаў іх суровай ніткай біяграфічнасці.

Уразіла сама манера гаварыць пра свой персанальны, асабіста пераж ыты досвед, не губляючы пры гэтым каштоўнасныя арыенціры агульначалавечага. Чытаеш яго нататкі і прыгадваецца слова, якое сучасныя беларускія літаратуразнаўцы практычна не ўжываюць да цяперашняга прыгожага пісьменства, бо няма да каго прыстасаваць. Слова гэтае — «гуманізм» (як прызнанне права ўсіх магчымых прыватных каштоўнасцяў на існаванне ў чалавечай супольнасці пры ўмове, што каштоўнасці жыцця і яе натуральныя патрэбы — свабода і добрасуседства, з'яўляюцца непарушнымі для ўсіх). Але пры гэтым чалавечыя патрэбы не адмаўляюць і не скасоўваюць права на вольнае існаванне іншых жывых істот, і пра гэта аўтар «Майго лістапада» гаворыць вобразна і запамінальна, праводзячы паралелі паміж натуральным, максімальна блізкім да прыроды светам свайго маленства, і сённяшнімі цывілізацыйнымі праблемамі.

Вось, здавалася б, згадвае ў «Натоўпе» пісьменнік прыватны выпадак са свайго дзяцінства — як жорстка і бязлітасна вяскоўцы забівалі бабра, які невядома чаму да людзей завітаў... А ты дык ніколі тых баброў і жыўцом не бачыла! Але і не маючы такога досведу, цалкам раздзяляеш выснову Усені: «Страшная з'ява — натоўп. Варта ў чыім-небудзь сэрцы запаліцца іскрынцы жорсткасці, як яна, іскрынка, разгараецца ў полымя і перакідваецца на іншых. І нічога немагчыма перайначыць». Практычна няма ў яго нататкі, успаміну, каб не было пад ім такога падагульнення, «маралі», што, у прынцыпе, і зразумела, бо пісаліся яны якраз для настаўлення нашчадкаў. Але само ўменне змяніць ракурс, па-апаратарску перавесці з малога на вялікае, уражвае і запамінаецца як адметнасць аўтарскага мастацкага стылю.

Але што цікава: напісаныя жывой чыстай мовай нататкі Усені выклікаюць не столькі жаданне разглядаць іх як уласна літаратурныя творы, колькі жаданне паспрачацца з ім як з чалавекам, так, як быў бы ён вашым суразмоўцам. Ну вось напрыклад. Расказвае ён, як у часы маленства вазамі, па некалькі разоў за дзень, вывозілі беларусы грыбы з лесу; пра момант, калі нават малыя маглі назбіраць за дзень да тысячы «белых», літаральна «пад грабеньчык» прачэсваючы кожны сантыметр лесу. А высновы робіць дзіўныя: «Адны кажуць, што шматлікія чароды дзікоў грыбніцу парушылі, другія — што лясы пастарэлі... Асабіста для сябе я знаходжу іншае тлумачэнне. Цяпер, маючы пэўны дабрабыт, я зрэдку выбіраюся ў лес дзеля забавы. А тады, у дзяцінстве, грыбы былі для нашай сям'і сродкам для выжывання. Прырода ўсё размяркоўвае мудра...» Так і хочацца сказаць: «Эх, дык не для адных жа Усеняў тыя грыбы ў лесе раслі!», але ж кніга на тое і кніга, каб весці маналог, а не дыялог.

Можна знайсці шмат прыкладаў такой непаслядоўнасці аўтарскай думкі, апраўдвання сваіх учынкаў заднім чыслом, а іншым разам і адкрытага «красавання», пыхі — от глядзіце, які я быў! Але цалкам закрэсліваюць гэтыя асобныя моманты тыя любоў, спагада, далікатнасць, якія выказвае пісьменнік у дачыненні да сваіх сяброў, знаёмых, настаўнікаў, імёны якіх, бывае, знаёмыя і мне. Асабліва цікава было чытаць пра тых, хто вучыўся і працаваў разам з Усенем, бо гэта не толькі журналісты, але часам і выдатныя паэты, пісьменнікі, крытыкі. Аўтар шмат цытуе вершаў — сваіх і чужых, і, прызнаюся, не раз ловіш сябе на думцы, што вось хочацца ўзяць у рукі кнігі тых аўтараў, бо неяк недаацэньвала іх, прапусціла.

Вось гэтае ўменне — вылучаць чужыя таленты і дабрадзействы, і разам з тым яўнае, добра бачнае памкненне ацэньваць сябе строга, па ўчынках, — самы прывабны момант у кнізе Алеся Усені «Мой лістапад».

**Ганна КІСЛІЦЫНА**

■ Напярэдадні

# «СЛАВЯНСКІ БАЗАР У ВІЦЕБСКУ»: нацыянальных Дзён не будзе

**У дырэкцыі Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» раскрылі інтрыгу яго новай канцэпцыі. Чым жа сёлетні «базар» будзе адрозівацца ад мінулых?**

Паводле слоў выканаўцы абавязкаў генеральнага дырэктара Цэнтра культуры «Віцебск» і дырэкцыі Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» Аляксандра Сідарэнкі, падчас чарговага фестывалю не будзе традыцыйных Дзён Беларусі, Расіі, Украіны. Увогуле стане меней фестывальных дзён — афіцыйна фэст будзе праводзіцца з 11 па 15 ліпеня. А спачатку задумвалася, што галоўныя падзеі «базару» будуць праходзіць на працягу тыдня.

— На фестывалі яшчэ большая ўвага будзе нададзена правядзенню традыцыйных Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні і дзіцячага музычнага конкурсу, — падзяліўся навіной з журналістам Аляксандр Сідарэнка. — У гала-канцэрце ўрачыстага адкрыцця фестывалю асобным блокам з'явіцца яркая прэзентацыя ўдзельнікаў конкурсаў. Мы робім акцэнт на гэтых падзеях з самага першага дня фестывалю...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

Приорбанк RZB Group

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
09 августа 2012
__________ Сушко С.А.

**УТВЕРЖДЕНО**
Протоколом
Наблюдательного совета
«Приорбанк» ОАО
04 июля 2012 № 6

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
## об открытой продаже облигаций «Приорбанк» Открытого акционерного общества 24-го выпуска

**1. Наименование эмитента (на белорусском и русском языках):**
На белорусском языке:
полное — «Пріорбанк» Адкрытае акцыянернае таварыства;
сокращенное — «Пріорбанк» ААТ.
На русском языке:
полное — «Приорбанк» Открытое акционерное общество;
сокращенное — «Приорбанк» ОАО.

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (E-mail):**
Юридический и почтовый адрес: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А, тел./факс 289 90 87, 289 91 91. Электронный адрес: info@priorbank.by.

**3. Сумма зарегистрированного уставного фонда:**
Размер зарегистрированного уставного фонда составляет 412 279 277 350 (Четыреста двенадцать миллиардов двести семьдесят девять миллионов двести семьдесят семь тысяч триста пятьдесят) белорусских рублей.

**4. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента, и сроки ее публикации:**
Периодическое печатное издание – газета «Звязда», не позднее 31 марта года, следующего за отчетным.

**5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента, место его нахождения, дата, номер государственной регистрации и наименование регистрирующего органа, номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, срок действия специального разрешения (лицензии):**
Наименование депозитария – «Приорбанк» ОАО.
Юридический и почтовый адрес – 220002, г. Минск, ул. В.Хоружей, 31-А.
Дата и место государственной регистрации – зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 12 июля 1991 г. под номером 12.
Специальное разрешение (лицензия) №02200/5200-1246-1080 на право осуществления Профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, зарегистрировано в реестре лицензий за № 5200-1246-1080, выдано Министерством финансов Республики Беларусь. Срок действия лицензии – до 30.05.2021 г.

**6. Дата и номер государственной регистрации эмитента, наименование регистрирующего органа:**
«Приорбанк» Открытое акционерное общество зарегистрировано в Национальном банке Республики Беларусь 12 июля 1991 года под номером 12.

**7. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение:**
Решение о выпуске облигаций принято Наблюдательным советом «Приорбанк» ОАО 04 июля 2012 года, протокол № 6.

**8. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии):**
Ознакомиться с подробной информацией (проспектом эмиссии) о выпуске облигаций можно начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций:
- в центральном офисе «Приорбанк» ОАО по адресу: г. Минск, В. Хоружей, 31-А с 9.00 до 12.30 и с 13.15 до 16.00,
- в информационном центре «Приорбанк» ОАО (ежедневно, кроме выходных и праздничных дней): по телефонам +375 17 289 90 90, 187 (в Минске), 487 (для абонентов Velcom, Life :), МТС).

**9. Цель выпуска облигаций и направление использования средств, полученных от размещения:**
Привлечение денежных средств для формирования ресурсной базы банка.

**10. Объем эмиссии, количество и форма выпуска облигаций и связанные с ними права:**
Объем эмиссии облигаций составляет 200 000 000 000 (Двести миллиардов) белорусских рублей.
Количество облигаций 2000000 (два миллиона) именных процентных бездокументарных конвертируемых облигаций.
Серия «ПР-24», номера «0000001-2000000».
Облигации выпускаются в бездокументарной форме (в виде записей на счетах).
Владелец облигации имеет право на получение по ней номинальной стоимости (основного долга), выплачиваемой при погашении облигации, а также на получение дохода в виде процентного дохода, начисляемого на номинальную стоимость облигаций.

**11. Номинальная стоимость:**
Номинальная стоимость одной облигации 100 000 (Сто тысяч) белорусских рублей.

**12. Период проведения открытой продажи облигаций:**
С 31 августа 2012 года по дату продажи последней облигации.

**13. Место и время проведения открытой продажи облигаций:**
Продажа облигаций осуществляется в «Приорбанк» ОАО по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А с 9.00 до 16.00 в рабочие в Республике Беларусь дни и/или на торгах ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».
В день начала открытой продажи облигации продаются по номинальной стоимости.
Начиная со второго дня открытой продажи, покупатель также уплачивает сумму накопленного процентного дохода за текущий период.

**14. Срок обращения облигаций и период начисления процентов:**
Срок обращения облигаций: 31 августа 2012 года по 31 августа 2015 года (1095 дней).
Дата погашения облигаций: 31 августа 2015 года.
Период начисления процентов: 31 августа 2012 года по 31 августа 2015 года (1095 дней).

**Дата начала погашения и порядок погашения облигаций:**
Для погашения облигаций владельцу необходимо осуществить перевод всего количества погашаемых бездокументарных облигаций данного выпуска на счет «депо» «Приорбанк» ОАО № 600100000225, раздел № 05 в депозитарии «Приорбанк» ОАО, код 002, корсчет «депо» ЛОРО № 1000002, раздел корсчета «депо» ЛОРО № 00 с основанием перевода: «Перевод ценных бумаг на счет «депо» эмитента в связи с их погашением» не позднее дня погашения облигаций. При совпадении дня погашения с выходными или праздничными днями перевод производится на следующий рабочий день.
Погашение облигаций осуществляется 31 августа 2015 года.
Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием «Приорбанк» ОАО. Дата закрытия и формирования реестра для погашения – 26 августа 2015 года. Со дня закрытия реестра для погашения владелец облигаций обязан прекратить все сделки с облигациями.
Эмитент осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев облигаций в дату погашения облигаций. Погашение облигаций производится денежными средствами в сумме и валюте номинала облигаций.
Обязанность по погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета Эмитента по реквизитам владельцев облигаций.

**15. Условия и размер выплаты дохода по облигациям, порядок его определения, даты формирования реестра владельцев облигаций:**
Процентная ставка по выпуску равна действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь минус 2% годовых.
Выплата дохода по облигациям осуществляется в белорусских рублях в виде процентного дохода за процентный период.
Даты выплат процентного дохода, начала процентного периода и даты формирования реестра владельцев облигаций:

| № процентного периода | Даты формирования реестра владельцев облигаций | Даты выплат процентного дохода/ дата начала процентного периода |
|---|---|---|
| | - | 31.08.2012 |
| 1 | 26.09.2012 | 30.09.2012 |
| 2 | 26.10.2012 | 31.10.2012 |
| 3 | 27.11.2012 | 30.11.2012 |
| 4 | 26.12.2012 | 31.12.2012 |
| 5 | 28.01.2013 | 31.01.2013 |
| 6 | 25.02.2013 | 28.02.2013 |
| 7 | 27.03.2013 | 31.03.2013 |
| 8 | 25.04.2013 | 30.04.2013 |
| 9 | 28.05.2013 | 31.05.2013 |
| 10 | 26.06.2013 | 30.06.2013 |
| 11 | 28.07.2013 | 31.07.2013 |
| 12 | 27.08.2013 | 31.08.2013 |
| 13 | 25.09.2013 | 30.09.2013 |
| 14 | 28.10.2013 | 31.10.2013 |
| 15 | 25.11.2013 | 30.11.2013 |
| 16 | 26.12.2013 | 31.12.2013 |
| 17 | 28.01.2014 | 31.01.2014 |
| 18 | 25.02.2014 | 28.02.2014 |
| 19 | 26.03.2014 | 31.03.2014 |
| 20 | 25.04.2014 | 30.04.2014 |
| 21 | 28.05.2014 | 31.05.2014 |
| 22 | 25.06.2014 | 30.06.2014 |
| 23 | 28.07.2014 | 31.07.2014 |
| 24 | 28.08.2014 | 31.08.2014 |
| 25 | 25.09.2014 | 30.09.2014 |
| 26 | 28.10.2014 | 31.10.2014 |
| 27 | 26.11.2014 | 30.11.2014 |
| 28 | 26.12.2014 | 31.12.2014 |
| 29 | 28.01.2015 | 31.01.2015 |
| 30 | 25.02.2015 | 28.02.2015 |
| 31 | 26.03.2015 | 31.03.2015 |
| 32 | 27.04.2015 | 30.04.2015 |
| 33 | 27.05.2015 | 31.05.2015 |
| 34 | 25.06.2015 | 30.06.2015 |
| 35 | 28.07.2015 | 31.07.2015 |
| 36 | 26.08.2015 | 31.08.2015 (выплата процентного дохода и погашение облигаций). |

В период от даты формирования реестра владельцев облигаций (не включительно) по дату выплаты процентного дохода (не включительно) может проводиться обращение облигаций на вторичном рынке, в данном случае процентный доход будет выплачен владельцу облигаций, указанному в реестре на дату формирования реестра владельцев облигаций.
Расчёт дохода производится путем его начисления на номинал облигации за период выплаты дохода по установленной процентной ставке по выпуску.
Расчёт дохода осуществляется по следующей формуле:

$$Д = \frac{Н_П \times П_{Д1} \times \left(\frac{T365}{365} + \frac{T366}{366}\right) + Н_П \times П_{Д2} \times \left(\frac{T365}{365} + \frac{T366}{366}\right) + \ldots +}{100}$$

$$\frac{+ Н_П \times П_{ДN} \times \left(\frac{T365}{365} + \frac{T366}{366}\right)}{100},$$

где:
Д – переменный процентный доход по облигациям;
Н*П* – номинальная стоимость процентных облигаций;
ПД*1*, ПД*2*, ...ПДN – ставка дохода (процентов годовых) за соответствующую часть периода, в пределах которого величина используемого для определения процентного дохода показателя была неизменной, установленная эмитентом;
Т365 – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
Текущая стоимость процентных облигаций рассчитывается по формуле:

$$С = Н_n + Д_н$$

где:
С – текущая стоимость процентных облигаций;
Н*п* – номинальная стоимость процентных облигаций;
Д*н* – процентный доход по облигациям (накопленный).
При совпадении дня выплаты процентного дохода или дня погашения облигаций с выходными или праздничными днями, выплата производится на следующий рабочий день, проценты за указанные дни не начисляются.

**16. Условия и порядок возврата средств инвесторам при признании выпуска облигаций несостоявшимся, запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь:**
«Приорбанк» ОАО в месячный срок с момента получения от регистрирующего органа уведомления о запрете выпуска ценных бумаг возвращает инвесторам средства (в т.ч., накопленный процентный доход), полученные в оплату размещенных ценных бумаг, и письменно уведомляет регистрирующий орган о возврате указанных средств инвесторам в полном объеме.
Эмитент не планирует отказ от выпуска ценных бумаг.

**17. Дата и номер государственной регистрации облигаций:**
№ 5-200-02-1601 от 09 августа 2012 г.

**18. Информация об обеспечении облигаций и другие условия выпуска:**
Выпуск облигаций согласован с Национальным банком Республики Беларусь 20 июля 2012 г. № 375. Размер обязательств по облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала. Собственный (нормативный) капитал «Приорбанк» ОАО по состоянию на 01 июня 2012 года равен 1 697 493,4 млн. руб. Эмитент осуществляет выпуск облигаций в пределах данных ограничений. Замена обеспечения исполнения обязательств по настоящему выпуску не предусмотрена.

**19. Порядок перехода права собственности на облигации на вторичном рынке, условия и порядок приобретения облигаций эмитентом до даты начала погашения, условия и порядок досрочного погашения облигаций:**
Эмитент имеет право выкупить облигации для перепродажи или досрочного погашения. Выкупленные облигации могут быть досрочно погашены по решению Эмитента.
Совершение сделок купли-продажи облигаций при их обращении (в том числе приобретение облигаций эмитентом) осуществляется в установленном законодательством порядке через торговую систему открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» и/или на внебиржевом рынке в любые дни, кроме выходных дней, праздничных дней, дат выплаты процентного дохода, дат сбора реестра владельцев облигаций, если иное не установлено законодательством.
На вторичном рынке облигации покупаются и продаются по договорной цене.

**20. Порядок и условия конвертации облигаций в облигации другого выпуска с более поздней датой погашения:**
Конвертация облигаций осуществляется на основании письменного согласия владельца облигаций с последующим заключением соответствующего договора.
Конвертация облигаций выполняется:
А. <u>До даты окончания срока обращения настоящего выпуска облигаций.</u> Операция проводится в отношении лиц, давших письменное согласие на конвертацию облигаций. Письменное согласие владельца облигаций на их конвертацию должно быть предоставлено эмитенту не позднее двух рабочих дней со дня направления эмитентом предложения посредством факсимильной связи владельцем облигаций с последующим представлением оригинала в течение 3-х банковских дней. Конвертация облигаций осуществляется в день и на условиях, указанных в предложении эмитента. Заключение соответствующих договоров между эмитентом и владельцем облигаций осуществляется в день, указанный в предложении эмитента.
Б. <u>При погашении облигаций настоящего выпуска.</u> Конвертация проводится в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием «Приорбанк» ОАО на дату погашения облигаций, указанную в пункте 15 настоящей Краткой информации, и давших письменное согласие на конвертацию облигаций. Конвертация осуществляется в дату погашения облигаций. Письменное согласие владельца облигаций на их конвертацию должно быть предоставлено эмитенту не позднее дня, предшествующего дате погашения облигаций. Заключение соответствующих договоров между эмитентом и владельцем облигаций осуществляется в день и на условиях, указанных в предложении эмитента.

**Временно и. о.**
**Председателя Правления** **С.И.Шишов**
**Главный бухгалтер** **В.В.Манцивода**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 28.08.2008 года. УНП 100220190.*

---

**г. ВИТЕБСК** **18.09.2012**

**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
